3 дні
ЗАСТАЛОСЯ ДА ВЫБАРАЎ ПРЭЗІДЭНТА

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

8 КАСТРЫЧНІКА 2015 г. ЧАЦВЕР № 193 (28051) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА


# Твой голас важны для Беларусі!

## ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА



**Яе называюць сталяром...**



**Утаймаваць маланку**

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Мікалай ШАРСТНЁЎ, старшыня Віцебскага аблвыканкама:**

*«Удзел у выбарах — гэта не столькі абавязак, колькі вялікае права грамадзяніна вызначаць будучыню сваёй краіны. Сёлетняя выбарчая кампанія адрозніваецца ад папярэдніх большай дасведчанасцю грамадзян. Зараз людзі зусім іншыя — больш інфармаваныя, упэўненыя, з цвёрдай жыццёвай і грамадзянскай пазіцыяй».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 8.10.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 17413,00 | ▼ |
| Еўра | 19562,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 276,70 | ▲ |
| Укр. грыўня | 818,76 | ▼ |


ISSN 1990 - 763X




Першакласніца з Мёраў Ганна Нікалаёнак з матуляй Ларысай паказваюць сваім гасцям з Мінска і Віцебска Рэспубліканскі ландшафтны заказнік «Ельня», які небеспадстаўна называюць «лёгкімі» кантынента. Экасцяжына, што выцягнулася па біятопе найбольш за два кіламетры, дае магчымасць бліжэй убачыць сапраўдную візітоўку нашай прыроды, на якую прыязджаюць паглядзець з усяго свету.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ТУТ ЛЁГКА ДЫХАЕЦЦА...

■ Выбары-2015

## ВЫБАРШЧЫКІ ПРЫХОДЗЯЦЬ СЕМ'ЯМІ

«Звязда» працягвае рэпартажы з датэрміновага галасавання

### Магілёў: найбольш актыўныя пенсіянеры

**У першы дзень датэрміновага галасавання толькі праз выбарчы ўчастак №5, які знаходзіцца на вуліцы Курака ў Магілёве, прайшлі 100 чалавек. Некалькі ахвотных аддаць свой голас дзяжурылі пад дзвярыма яшчэ за 15 хвілін да адкрыцця.**



Фота Васіля ЗЯНЬКО.

**Дзіна і Аляксандр ЮРАСАВЫ з сыночкамі-блізнятамі Кірылам і Данілам прыйшлі на Цэнтральны выбарчы ўчастак №5 у Стоўбцах прагаласаваць датэрмінова. У нядзелю ў іх запланавана паездка ў сталіцу, дзе малыя змогуць пацешыцца праграмай Беларускага дзяржаўнага цырка.**

■ Жыццё за МКАД

## «ЧАЛАВЕК МУСІЦЬ ЖЫЦЬ НА ЗЯМЛІ»

Грамадскасць прапануе альтэрнатыву гарадскому ўшчыльненню

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка супраць ушчыльнення Мінска і лічыць, што трэба будаваць больш жылля і інфраструктуры за МКАД. Аб гэтым кіраўнік дзяржавы днямі заявіў падчас наведвання новага ўчастка другой Мінскай кальцавой аўтадарогі. На думку Аляксандра Лукашэнкі, нешта і ў Мінску можна дабудаваць у якасці ўшчыльнення, але захапляцца не варта. «Не трэба занадта ўшчыльняцца ў Мінску: насельніцтва ўжо пачынае крыўдзіцца. За кальцавой дарогай (у раёне Заслаўя, Радашковічаў, Жодзіна, Смалявічаў, Рудзенска, Фаніпаля, Дзяржынска) — мора месцаў, дзе можна будаваць жыллё і іншыя аб'екты», — звярнуў увагу Прэзідэнт. «Паралельна неабходна ўдасканальваць сістэму зносін, дапаўняючы аўтатранспартны рух чыгуначным», — дадаў кіраўнік дзяржавы. «Гэта будзе зручна, і мы не перанасыцім Мінск», — сказаў ён, яшчэ раз падкрэсліўшы, што жыллё ў сталіцы неабходна будаваць па мінімуме. «Няма чаго сцягваць усіх у Мінск. Сёння тут жыве амаль два мільёны, пятая частка насельніцтва. Калі яшчэ падцягнем, будзе, як у Маскве, не павярнуцца», — папярэдзіў Аляксандр Лукашэнка. Праблема ўшчыльнення сталіцы не менш хвалюе і саміх мінчан. Карэспандэнт «Звязды» нядаўна папрысутнічала на абмеркаванні гэтага пытання ініцыятыўнымі гараджанамі і выслухала іх прапановы.**

### НЕ ЎВЫШЫНЮ, А ЎШЫРЫНЮ

**Міхаіл МАЛАШ** восем гадоў жыве ў сваім доме. З «бетоннай каробкі» ў мегаполісе перабраўся за горад, калі зразумеў: паспяховыя людзі ва ўсім свеце жывуць у дамах, а кватэра — гэта часовае жыллё. «Калі зносяць катэджную забудову і будуюць шматпавярховікі — гэта дэградацыя», — перакананы Міхаіл. Разам з прадстаўнікамі мінскага грамадскага аб'яднання «Экаград» і экспертамі ён арганізаваў серыю круглых сталоў, на якіх абмяркоўваюць мэтазгоднасць выкарыстання 15-кіламетровай прыгараднай зоны Мінска пад малапавярховую жылую забудову.


СТАР. 3

### АДБЫЛАСЯ ТЭЛЕФОННАЯ РАЗМОВА ПРЭЗІДЭНТАЎ БЕЛАРУСІ І РАСІІ

Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін коратка абмеркавалі некаторыя актуальныя пытанні двухбаковага парадку дня, супрацоўніцтва ў інтэграцыйных аб'яднаннях, паведамілі ў прэсслужбе кіраўніка беларускай дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка цёпла павіншаваў Уладзіміра Пуціна з днём нараджэння.

# ВЕК ІНДЫВІДУАЛЬНАЙ МЕДЫЦЫНЫ

Адкрыццё Рэспубліканскага цэнтра пазітронна-эмісійнай тамаграфіі дазваляе ахове здароўя зрабіць вялікі крок наперад

**ПЭТ-цэнтр у Рэспубліканскім цэнтры анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М. Аляксандрава адкрыўся ўчора з удзелам Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі.**

Абсталяванне цэнтра дае магчымасць праводзіць раннюю дыягностыку анкалагічных, неўралагічных і кардыялагічных захворванняў, прызначаць дакладную схему лячэння, выбіраючы для кожнага пацыента лекі, якія падыходзяць яму найлепш. Такім чынам Беларусь у ліку першых уступае ў век індывідуальнай, персаніфікаванай медыцыны.

Падчас наведвання РНПЦ Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з аснашчэннем ПЭТ-цэнтра, пабываў у яго лабараторыях, а таксама ў Рэспубліканскай малекулярна-генетычнай лабараторыі канцэрагенэзу, якая была ўведзена ў эксплуатацыю ў жніўні 2015 года. Акрамя таго, Прэзідэнту было даложана аб стане РНПЦ анкалогіі, яго перспектывах, развіцці дыягностыкі, прафілактыкі і тэрапіі анкалагічных захворванняў, дасягненнях анкаслужбы і сістэмы аховы здароўя наогул, вытворчасці айчынных проціпухлінных прэпаратаў.

У РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М. Аляксандрава Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з удзельнікамі навукова-практычнай канферэнцыі «Новыя тэхналогіі ў медыцыне».

Прэзідэнт падчас сустрэчы звярнуў увагу, што ў Беларусі за апошнюю пяцігодку ў ахову здароўя ўкладзены вялікія сродкі. Кіраўнік дзяржавы патрабуе эфектыўнай аддачы ад укладзеных у галіну грошай. Ён нагадаў, што на дзяржаўным узроўні былі прыняты сур'ёзныя меры для паляпшэння якасці работы медыцынскіх устаноў, пачынаючы ад сельскіх ФАПаў, участковых, раённых бальніц да рэспубліканскіх навукова-практычных цэнтраў. Аляксандр Лукашэнка таксама сказаў, што плануецца сур'ёзна праінспектаваць работу медыцынскіх устаноў, каб увогуле праверыць узровень медыцынскай дапамогі, якая аказваецца. Гэта датычыцца як рэспубліканскіх цэнтраў, так і многіх раённых, участковых бальніц, ФАПаў.

У верасні Прэзідэнт Беларусі з трыбуны Генасамблеі ААН гаварыў аб дасягненнях беларускіх медыкаў, у тым ліку адносна скарачэння дзіцячай і мацярынскай смяротнасці. Па многіх паказчыках беларуская сістэма аховы здароўя знаходзіцца на перадавых пазіцыях. Можна сказаць, што гэтая галіна мае і палітычны складнік, паколькі замежныя бізнесмены, бачачы дасягненні Беларусі, пачынаюць ісці сюды са сваімі інвестыцыямі і ідэямі.

Аляксандр Лукашэнка даручыў прапрацаваць магчымасць стварэння ў Беларусі цэнтра па клетачных тэхналогіях, аб якім ішла размова падчас вышэйзгаданай канферэнцыі. Як падкрэсліў Прэзідэнт, выбар правільнага шляху далейшага развіцця медыцыны вельмі важны. На яго думку, трэба максімальна канцэнтраваць веды і вопыт, каб рухацца наперад. Што датычыцца перспектыў стварэння цэнтра па клетачных тэхналогіях, то, як лічыць Аляксандр Лукашэнка, неабходна вывучыць замежную практыку і з яе ўлікам вызначыць патрэбны напрамак.

Увогуле ж, у беларускай медыцыне своечасова вызначылі асноўныя кірункі работы і пачалі рабіць сур'ёзныя захады для зніжэння анказахваральнасці, смяротнасці ад сардэчна-сасудзістых захворванняў. Як адзначыў Прэзідэнт, галоўная задача — вырашыць дэмаграфічную праблему, каб узровень смяротнасці быў значна перакрыты за кошт нараджальнасці. Дынаміка ў гэтым напрамку вельмі добрая. «Ахове здароўя мы надаём асаблівую ўвагу, так і будзе ў далейшым, таму што гэта жыцці людзей», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. У прыярытэце застаецца таксама адукацыя.

Прэзідэнт прапанаваў удзельнікам канферэнцыі вызначыць, як перадаць вядучыя медыцынскія тэхналогіі рэгіёнам. Неабходная матэрыяльная база для гэтага ствараецца.

«У краіне трэба прадоўжыць укараненне прынцыпова новых падыходаў да дыягностыкі і лячэння захворванняў», — падкрэсліў Прэзідэнт. «Задача адна — не спыняцца на дасягнутым», — сказаў ён, высока ацаніўшы ўкаранёныя ў РНПЦ анкалогіі сучасныя тэхналогіі. Аляксандр Лукашэнка лічыць важным, што ў Беларусі своечасова звярнулі ўвагу на неабходнасць стварэння такога РНПЦ і пабудавалі яго, а цяпер пастаянна мадэрнізуюць і абнаўляюць. Але, на яго думку, пабудаваць і аснасціць цэнтр — гэта паўсправы, галоўнае — гэта людзі. «Для мяне важна было паглядзець на тых, хто тут працуе. Не важна, хто гэта — спецыялісты паважанага ўзросту або моладзь, галоўнае, каб мазгі мелі і маглі працаваць. Я тут убачыў моладзь, у якой блішчаць вочы і якая ўжо ўмее працаваць. Гэта наша будучыня, значыць, што грошы ўкладзены не дарэмна», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

На сустрэчы з удзельнікамі канферэнцыі гаварылі аб праблемах, а таксама аб перспектывах развіцця медыцыны, у прыватнасці дыягностыкі і лячэння анказахворванняў. Кіраўнікі медыцынскіх цэнтраў у тым ліку ўзнялі пытанне аптымізацыі штатнага раскладу, і ў выніку было прынята рашэнне, што ім дадуць магчымасць самім перафарміроўваць штатны расклад з улікам асаблівасцей кожнай асобна ўзятай установы.

Таксама падчас сустрэчы ўзнімалася праблема жылля для маладых спецыялістаў. Аляксандр Лукашэнка паабяцаў разгледзець пытанне будаўніцтва інтэрната для маладых медыкаў у Бараўлянах. Прэзідэнт даручыў прапрацаваць яго кошт і далажыць яму вынікі.

**Паводле БЕЛТА.**

**Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуе з прычыны смерці пісьменніка і публіцыста Алеся Ануфрыевіча САВІЦКАГА і выказвае спачуванні яго родным і блізкім.**

# ВЫБАРШЧЫКІ ПРЫХОДЗЯЦЬ СЕМ'ЯМІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Старшыня ўчастковай камісіі Людміла ЕЛІСЕЕВА** ў выбарчай справе ўжо не навічок. У складзе выбарчай камісіі працавала яшчэ ў 1994 годзе, калі праходзілі першыя выбары на пасаду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. І потым ніводных не прапускала. Апошнія 10 гадоў з'яўляецца старшынёй на гэтых адказных мерапрыемствах. Так што параўнаць ёсць з чым.

— Падабаецца, што выбары пачаліся спакойна, неадэкватных людзей няма, — кажа Людміла Аркадзеўна. — Хаця ў мінулыя гады розныя выпадкі бывалі. Некаторыя прыходзілі менавіта паскандаліць, прычапіцца да чаго-небудзь. Нешта ўсё фатаграфавалі. Але чаго нам баяцца. Усё ідзе ў адпаведнасці з законам. Мы нічога не хаваем, хай фатаграфуюць.

Найбольшую актыўнасць праяўляюць пенсіянеры. Нехта для гэтага спецыяльна ехаў з дачы. Чулі прагноз, што ў нядзелю будзе вельмі холадна, таму вырашылі, што лепш прыйсці, пакуль спрыяе надвор'е.



Другі ўсплёск электаральнай актыўнасці пасля ранішняга адбыўся вечарам. Скончыўся працоўны дзень, і каля стала з бюлетэнямі час ад часу нават стваралася невялічкая чарга. Хударлявы малады чалавек з кійком уважліва вывучыў на стэндзе інфармацыю пра кожнага кандыдата ў Прэзідэнты, а потым рашуча пайшоў па бюлетэнь. «Вось на ўсялякі выпадак прыйшоў прагаласаваць датэрмінова, — патлумачыў Сяргей Сакалоў. — Днямі кладуся на аперацыю. Вырашыў выканаць спачатку свой грамадзянскі абавязак».

Да стала падышла жанчына з маленькім хлопчыкам. Таму ўсё цікава: «А што гэта за скрыня? А для чаго яна? Мы туды нешта будзем кідаць?» Маці тлумачыць малому, што гэта выбары кіраўніка краіны і трэба паводзіць сябе ціша, каб не перашкаджаць камісіі працаваць.

— Людзі прыходзяць цэлымі сем'ямі і нават разам з суседзямі, — усміхаюцца **члены камісіі Святлана КОНЮХАВА і Рыгор НОВІКАЎ**. — Актыўнасць прыемна здзіўляе. Усе разумеюць, навошта прыйшлі. Адзін, праўда, спытаўся, ці маглі б мы паўплываць на тое, каб у пад'ездзе вокны адрамантавалі...

Калі чалавек пашпарт забыўся, камісія разглядае правы кіроўцы, ваенны білет або іншы дакумент з фота і пячаткай. Калі пашпарт на пераафармленні, дастаткова паказаць адпаведную даведку. Адзін мужчына папярэдзіў, што яго жонка захварэла, і прасіў прыйсці дамоў. «Але мы зможам зрабіць гэта толькі ў дзень выбараў, 11 кастрычніка», — удакладніла Людміла Елісеева.

Чарговыя наведвальнікі — муж з жонкай. Марына з Мікалаем ехалі з дачы і вырашылі датэрмінова прагаласаваць. І малога свайго прыхапілі: хай адчувае, што таксама далучыўся да адказнай справы.

Пакуль урны для галасавання на ўчастку звычайныя, але ў дзень выбараў будуць выкарыстоўвацца празрыстыя. Яны стаяць збоку, чакаюць свайго часу. На гэтым участку такія будуць прымяняцца ўпершыню. Побач знаходзяцца яшчэ дзве маленькія скрыні для выездаў дамоў. У дзень выбараў плануецца наведаць 50 чалавек, якія самастойна прыйсці не змогуць. Наогул на ўчастку зарэгістравана 2582 чалавекі.

— Прычым 28 з іх будзе галасаваць упершыню, — удакладняе Людміла Елісеева.— Мы для іх ужо падрыхтавалі віншавальныя паштоўкі з магнітамі. На памяць пра тое, як яны ў першы раз прыйшлі на выбарчы ўчастак. Змогуць потым паказваць сваім дзецям і ўнукам.

— У Магілёўскай вобласці ў панядзелак адкрыліся 746 участкаў для датэрміновага галасавання, — паведаміў «Звяздзе» **старшыня абласной выбарчай камісіі Валерый БЕРАСТАЎ**. — Напярэдадні мы іх усе праверылі, ніякіх заўваг не было. Сувязь працуе, колькасць урнаў дастатковая, зманціраваны кабіны для тайнага галасавання, ёсць усё неабходнае для нармальнай працы, для таго, каб кожны ахвотны змог аддаць свой голас у падтрымку аднаго з чатырох кандыдатаў.

## Гродна:

## «У поўнай адпаведнасці з кодэксам»

**— Я не ўпершыню працую ва ўчастковай выбарчай камісіі на прэзідэнцкіх выбарах. Аднак вопыт вопытам, а ўсё роўна хвалюешся і адчуваеш вялікую адказнасць, каб гэтая найважнейшая падзея ў жыцці нашай краіны прайшла паспяхова, так бы мовіць, без сучка і задзірынкі. Гэта наша асноўная задача, — кажа старшыня Гродзенскай участковай выбарчай камісіі №12 па выбарах Прэзідэнта Беларусі Аляксандр КАРЭЎСКІ.**

На пытанне карэспандэнта «Звязды» пра тое, як прайшоў першы дзень датэрміновага галасавання, ён адказвае:

— У поўнай адпаведнасці з Выбарчым кодэксам Беларусі. Мы своечасова распачалі работу нашай участковай камісіі, апячаталі урну і непасрэдна распачалі працэс галасавання. Трэба сказаць, выбаршчыкі праявілі даволі высокую актыўнасць. Увогуле 6 кастрычніка прагаласавалі 223 чалавекі, сярод якіх і пажылыя людзі, і студэнцкая моладзь. Ніякіх нештатных сітуацый не было. Назіральнікі пакінулі выключна станоўчыя водгукі, што ўсё ў парадку.

На ўчарашні дзень назіральнікамі на гэтым выбарчым участку зарэгістраваліся сем чалавек, сярод якіх прадстаўнікі БРСМ, аб'яднання «Белая Русь», Камуністычнай партыі Беларусі. А **юрыста па адукацыі Вольгу ГЕРАСІМАВУ** у склад назіральнікаў дэлегавалі шляхам збору подпісаў жыхароў, якія з'яўляюцца выбаршчыкамі на гэтым участку. Яна не чакала, што ў першы дзень будзе столькі ахвотных прагаласаваць:

— Выбаршчыкі пачалі прыходзіць літаральна адразу ж пасля адкрыцця ўчастка. Асабліва актыўнымі былі пажылыя людзі, некаторыя з прычыны паважанага ўзросту маглі, пэўна, папрасіць прыйсці да іх з урнай для галасавання дамоў. Але яны так не зрабілі — самі прыйшлі на ўчастак. Панавала вельмі добразычлівая атмасфера, ніякіх парушэнняў не было.

Аднымі з першых учора на выбарчы ўчастак №12 прыйшлі **студэнткі Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Вольга КУЗЬМІЦКАЯ і Алена КРАДЗІНА**. Прагаласаваць датэрмінова дзяўчаты вырашылі з той прычыны, што яны іншагароднія і ў нядзелю збіраюцца наведаць бацькоў.

— Для мяне сёння вельмі важная падзея, бо ўпершыню ўдзельнічаю ў выбарах Прэзідэнта Беларусі і маю магчымасць выказаць сваё меркаванне, — кажа Вольга.

— У першую чаргу, зразумела, адчуваеш адказнасць, што і твой голас нешта вырашае, — зазначае Алена.

А вось **Альберт Леанідавіч МЕРСОН** найперш зычыць здароўя дзецям, унукам, усім беларускім грамадзянам:

— Усё ў нашай краіне будзе нармальна, — не сумняваецца ён.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*

■ Блізкая ўлада

# ГАЗ ПРЫЙДЗЕ І Ў ВЁСКУ

**На сустрэчы старшыні Брэсцкага аблвыканкама Анатоля ЛІСА з працаўнікамі Пружанскага малочнага камбіната ўзнімалася шмат пытанняў па развіцці вытворчасці і функцыянаванні сацыяльнай сферы.**



Фота Аляксандра ШУЛЬГАЧА.

Анатоль ЛІС на сустрэчы з працаўнікамі завода.

Варта сказаць, што малакаперапрацоўчае прадпрыемства ў Пружанах належыць да тых заводаў, якія своечасова правялі мадэрнізацыю вытворчасці, а зараз атрымліваюць аддачу ад укладзеных сродкаў. У 2009-м і наступных гадах упор быў зроблены на лінію па вырабе сыроў. І сёння камбінат пастаўляе на экспарт 85 працэнтаў сваёй прадукцыі. Падчас сустрэчы прагучала такая лічба — сярэдняя зарплата працаўнікоў перавысіла дзевяць мільёнаў рублёў.

Сыравінную зону прадпрыемства складаюць 10 гаспадарак раёна. Таму зразумелай была цікавасць людзей да перспектыў развіцця сельскай гаспадаркі рэгіёна. Анатоль Ліс адзначыў, што большую частку малака, якое атрымліваюць гаспадаркі вобласці, ужо зараз можа перапрацаваць адзін «Савушкін прадукт». Таму стаіць задача развіваць жывёлагадоўчую галіну, павялічваць пагалоўе кароў. І ўжо на найбліжэйшыя пяць гадоў ёсць планы давесці пагалоўе дойнага статка да 300 тысяч галоў (цяпер іх каля 270 тысяч).

Удзельнікі сустрэчы ўздымалі пытанні газіфікацыі сельскіх населеных пунктаў. Усім хацелася б, каб газ хутчэй прыйшоў у іх жылыя дамы. Кіраўнік вобласці сказаў, што большасці кааператываў давядзецца пачакаць некалькі гадоў. Як вядома, насельніцтва аплачвае прыкладна трэцюю частку расходаў па газіфікацыі, астатняе бярэ на сябе дзяржава. Зараз са зразумелых прычын ёсць цяжкасці з папаўненнем бюджэту. Калі фінансавая сітуацыя стабілізуецца, тады і надыдзе час вярнуцца да праграмы блакітнага паліва.

Маладыя працаўнікі камбіната актыўна задавалі пытанні, якія датычацца фарміравання цэн на паслугі ЖКГ і электраэнергію, а таксама будаўніцтва жылля. Кіраўнік вобласці даваў падрабязныя адказы. Пры гэтым падкрэсліў, што выкананне сацыяльных праграм наўпрост залежыць ад папаўнення бюджэту, а значыць, ад стабільнай і паспяховай работы прамысловасці.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

*Пружаны*

■

# «ЧАЛАВЕК МУСІЦЬ ЖЫЦЬ НА ЗЯМЛІ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На думку Міхаіла і яго паплечнікаў, праблема ўшчыльнення горада апошнім часам абвастрылася настолькі, што час распрацоўваць метады па супрацьстаянні ёй. Адным з іх можа стаць катэджная забудова прыгарада. Яе мэтазгодНасць яшчэ плануюць разгледзець з сацыяльнага, экалагічнага, архітэктурнага, сельскагаспадарчага пунктаў гледжання, а таксама паводле фактару нацыянальнай бяспекі. Падчас першага круглага стала абмяркоўвалі эканамічны і этнакультурны фактары.

— Мы разумеем, што ўшчыльненне звязана з неабходнасцю развіваць Мінск і вырашаць жыллёвыя праблемы тых гараджан, якія маюць у гэтым патрэбу — такіх на сёння 270 тысяч, — заўважыў мадэратар мерапрыемства, **старшыня аргкамітэта «Экаграда» Віктар ЯНЧУРЭВІЧ**. У сувязі з гэтым ён прапанаваў «развіваць горад не ўвышыню, а ўшырыню».

**«У нас пяць дзяцей заканчваюць школу здаровымі, а 95 — хворымі, і, на мой погляд, у 80% на гэта паўплывала асяроддзе жыцця. Гэта нацыянальная бяда».**

— Калі на сям'ю з чатырох чалавек выдзеліць участак зямлі ў 10 сотак, то плошчы ў 15-кіламетровай зоне вакол Мінска хопіць, каб рассяліць 800 тысяч чалавек — гэта значна больш, чым людзей, якія маюць праблемы з жыллём, — зазначыў Міхаіл Малаш.

Пры гэтым інфраструктура прыгарада будзе развівацца паралельна з забудовай, упэўнены ён.

## «БУДАВАЦЬ МЫ МОЖАМ ПАЧАЦЬ УСЕ»

**Доктар эканамічных навук, прафесар Сяргей ПЕЛІХ** зазначыў, што за час сваіх падарожжаў (быў у многіх краінах свету, наведаў усе кантыненты, апроч Аўстраліі) пераканаўся: чалавек мусіць жыць на зямлі.

— Мы пачынаем ісці насуперак нашай біялогіі і векавым традыцыям. Калісьці мы гэты шлях скончым і будзем, як «хрушчоўкі», руйнаваць усё і будаваць наноў, панясём вялізныя эканамічныя страты, — лічыць прафесар. — Я пачую па радыё, што ў нас пяць дзяцей заканчваюць школу здаровымі, а 95 — хворымі, і, на мой погляд, у 80% на гэта паўплывала асяроддзе. Гэта нацыянальная бяда.

Шматпавярховая забудова сапраўды можа нанесці шкоду здароўю. У ёй у чалавека дужа абмежаваная прастора для жыцця, побач — такія ж вышынныя бетонныя «каробкі». Апроч псіхалагічнага дыскамфорту, на які ўрбанізаванае насельніцтва ўжо не звяртае ўвагі, мы пастаянна адчуваем яшчэ і фізічны: у кватэрах ці то занадта душна, ці то холадна, матэрыялы ў нашым гарадскім жыллі рэдка бываюць натуральнымі. Дабавіць сюды шкодныя рэчывы ў паветры, якія падымаюцца ўверх, і становіцца зразумела, адкуль столькі захвораванняў на алергію і нават анкалогію.

На высокія паверхі цяжка паднімацца сталым людзям, маці з калясками, несці ровар, не гаворачы ўжо пра праблему перапоўненых аўтамабілямі двароў. Не спрыяюць шматкватэрныя дамы і ўмацаванню сямейных сувязяў у адрозненне ад катэджаў, дзе ў адным доме могуць жыць некалькі пакаленняў.

Сяргей Пеліх мяркуе, што азначэнне «чыстае жыллё» не трапляе нават у 15-кіламетровую зону вакол сталіцы, як мінімум неабходна жыць у 20 кіламетрах ад вялікага горада, а то і болей.

— Горад цяпер у палоне памылковых інвестыцый. Неабходна зрабіць, як у Германіі, будаўніцтва жылля ў межах МКАД толькі са спецыяльнага дазволу ўрада. Мы павінны дзейнічаць канцэптуальна, — перакананы эксперт.

На думку Сяргея Пеліха, у краіне «будаўнічая мафія» (так ён называе прыватных забудоўшчыкаў) штучна стварыла ўмовы, калі людзі, каб не страціць свае фінансавыя зберажэнні, скупляюць жыллё. А льготы на жыллё, якія існуюць для пэўных катэгорый, ствараюць падмурак для карупцыі. «Я ведаю тых, у каго ўжо па 3-4 кватэры куплена», — дадае прафесар. Па яго словах, сітуацыя загнання інвестыцый у жыллёвы сектар пазбаўляе нас прамысловай, эканамічнай і навуковай будучыні, для якой наша краіна мае магутны патэнцыял.

Прафесар Пеліх бачыць выйсце ў заходняй мадэлі іпатэкі для катэджнага будаўніцтва, якое павінна складаць 80% ад усёй жылой забудовы.

— Як гэта ні дзіўна, будаваць мы можам пачаць усе. Укласці ў гэтую справу пры рэальных умовах трэба 50—100 млрд, каб настаўнікі, урачы і іншыя маглі ўзяць грошы ў крэдыт і купіць зямельны ўчастак, — патлумачыў эканаміст. — 15 сотак будуць каштаваць 5—10 тысяч долараў — гэта кожны беларус адолее. Далей, як вучылі мяне ў Германіі, ідзяце да архітэктара, што павінен падпісаць праект будаўніцтва дома, у якім абавязкова будзе цокальны паверх і 29 кв. м плошчы на чалавека. Плюс, калі гэта маладая сям'я, разлік яшчэ на траіх дзяцей — усяго пяць пакояў і адзін гасцявы. Бо тыя


Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

50—60 «квадратаў», якія мы мелі ў Савецкім Саюзе, — гэта нонсэнс.

Пасля выдзяляюцца грошы на некалькі этапаў будаўніцтва (пры гэтым прадстаўнікі банка мусяць вывучыць праект і пераканацца, што чалавек сапраўды збіраецца будаваць дом) на 30—35 гадоў пад 1,5—2, максімум 5% гадавых. Такім чынам рэальна за 5—7 гадоў атрымаць свой дом.

## КАБ НЕ СТАЦЬ АХВЯРАЙ НАЖЫВЫ

Пра этнакультурны аспект перавагі малапавярховай забудовы прыгарада распавёў **магістр філасофскіх навук Дзмітрый КУНІЦКІ.**

— Мінск з'яўляецца самым шчыльназаселеным горадам Еўропы. Пасля вайны адбыўся дзікі рост насельніцтва, а гэта не прамысловы рэгіён.

Прычыны гэтага эксперт бачыць у бальшавіцкай ідэі разбурэння сялянскай абшчыны і патрыярхальнага ўкладу, а таксама тэхнацэнтрызме.

— Нядаўна да мяне трапіла фатаграфія плана горада пасляваеннага часу. Там — нізкапавярховая забудова, азеляненне, фантанчыкі — тое, пра што мы гаворым сёння.

Асноўная плынь урбанізацыі ў СССР адбылася ў 1960—1970-я гады. Цяпер гэтая «хвароба» працягваецца, нягледзячы на дзяржаўны курс апошніх гадоў развіваць гарады-спадарожнікі і на агульнаеўрапейскую тэндэнцыю адсутнасці татальнага імкнення насельніцтва краіны жыць у сталіцы. Беларусы ж ірвуцца ў Мінск як у ледзь не адзіны прыдатны для жыцця горад, а тым часам на іх памкненні нажываюцца прыватныя забудоўшчыкі і буйныя карпарацыі. І калі б толькі на іх... А між тым сітуацыя панавання шматпавярховікаў — абсалютна не характэрная для нашых традыцый, і зусім не таму, што раней не было тэхналогій, якія б дазвалялі іх узводзіць.

— У хрысціянскіх краінах увогуле было забаронена будаваць жыллё, вышэйшае за крыжы на саборах. У каталіцкім Кёльне гэта да сёння недапушчальна на ўзроўні муніцыпалітэта, — адзначыў Дзмітрый Куніцкі.

**Лаўрэат дзяржаўнай прэміі СССР у галіне архітэктуры Барыс ЮРЦІН** лічыць, што пытанне «Дзе лепей жыць?» не павінна нават абмяркоўвацца. Архітэктар ацэньвае рэаліі цвяроза:

— Сітуацыя такая, што, груба кажучы, з панядзелка перайсці на жыццё ў дамах мы не зможам. У гэты бок павінна павярнуцца ўся дзяржаўная палітыка.

**Беларусы рвуцца ў Мінск як у ледзь не адзіны прыдатны для жыцця горад, а тым часам на іх памкненні нажываюцца прыватныя забудоўшчыкі і буйныя карпарацыі.**

Аднак такія «парасткі», на думку Барыса Юрціна, у Мінску ўжо ёсць: у якасці прыкладаў архітэктар прывёў забудову Драздоў і раёна за Нацыянальнай бібліятэкай.

У найбліжэйшы час грамадскасць плануе правесці яшчэ шэраг круглых сталоў і разам з экспертамі прааналізаваць іншыя фактары. Па выніках будзе падрыхтавана абгрунтаванне, з якім актывісты збіраюцца выходзіць на Мінгарвыканкам з прапановай аб стварэнні рабочай групы для дэталёвай прапрацоўкі пытання малапавярховай забудовы прыгарада.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.** *seradzyuk@zviazda.by*

---

■ Галоўныя каштоўнасці

# ТОЕ, ШТО НАС АБ'ЯДНОЎВАЕ

**Чытанне дапамагае аб'яднаць сям'ю, сведчыць аб адукаванасці грамадства і робіць дарослых маладзейшымі, калі яны разам з дзецьмі бавяць час з кнігай у руках. Праз друкаванае слова чалавек фарміруе каштоўнасці, якія робяць яго асобай. Такія думкі агучылі ўдзельнікі круглага стала «Моцная сям'я — моцная дзяржава», абмяркоўваючы старт рэспубліканскага праекта «Сямейнае чытанне», які мусіць прывіць беларусам моду быць начытанымі.**

### Чытаем разам

Новае пачынанне выклікала жывы водгук у суразмоўцаў: нельга не пагадзіцца са своечасовасцю прапаганды чытання ў грамадстве.

*— Менавіта грамадская суполка фарміруе каштоўнасці, якія перадаюцца наступным пакаленням. Іх нельга навязаць зверху, адміністрацыйнымі метадамі. Тое, што дзяржава зацікаўлена, каб людзі чыталі, вельмі добра. Трэба рабіць акцэнт менавіта на сямейным чытанні — на стварэнні пэўнай сямейнай бібліятэчкі,* — зазначыла **Марыяна ШЧОТКІНА, старшыня Беларускага саюза жанчын.** *— Нішто не можа выхаваць лепш, чым уласны прыклад бацькоў і кніга. Высокаадукаванае, культурнае грамадства — гэта тое, якое чытае. Адкул бацькі не чытаюць, то і дзеці не будуць рабіць гэта, таму трэба скіраваць вектар працы так, каб ахапіць усіх.*

Удзельнікі круглага стала выказалі пэўныя прапановы па папулярызацыі друкаванага слова ў краіне.

**Старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай ЧАРГІНЕЦ** узгадаў часы, калі здабыць многія мастацкія выданні было нялёгкай справай, але ў кожнай сям'і была бібліятэка. Ён параіў і зараз ствараць у сем'ях пэўны бібліятэчны фонд, які б дапамагаў выхоўваць у дзяцей найлепшыя якасці. Для заахвочвання людзей чытаннем Мікалай Іванавіч прапанаваў развіць конкурс «Моцная сям'я — моцная дзяржава» і ў фармаце дзіцячых садкоў.

*— За гэты год мы правялі больш за 200 конкурсаў сярод школьнікаў і студэнтаў, і яны пішуць такія творы, якімі проста зачытваешся. А дух спаборніцтва і эмоцыі, якія ўзнікаюць у дзяцей і іх бацькоў падчас правядзення конкурсаў, — гэта сапраўдная скарбніца. Можна ўручаць кнігі як сувеніры, як узнагароды. Трэба палепшыць рэкламу і культуру чытання кніг на тэлебачанні і радыё.*

Мікалай Чаргінец дадаў, што ў краіне ўжо распрацаваны ўмовы конкурсу на найлепшую чытаючую сям'ю, такім чынам, трэба думаць, што хутка стартуе яшчэ адна рэспубліканская акцыя.

**Антаніна МОРАВА, сустаршыня Беларускага саюза жанчын**, узгадала акцыю «Маміна казка», якая два гады таму праводзілася БСЖ сумесна з Міністэрствам інфармацыі. Тады цудоўныя выданні, якія выйшлі ўжо трэцім тыражом, былі падораны дамам-інтэрнатам. Антаніна Пятроўна адзначыла, што зараз у кране мала айчынных прапаноў кніг для самых маленькіх.

*— На днях майму чацвёртаму ўнуку спаўняецца два гады, і я панясу яму кнігі — такія цудоўныя выданні, дзе адчыняюцца акенцы, перасоўваюцца фігуркі... На жаль, гэта расійскія кнігі, бо сваіх выданняў такога кшталту ў нас не хапае, хаця яны карыстаюцца вялікім попытам, і трэба неяк выпраўляць становішча. Папяровая кніга нясе не толькі выхаваўчую функцыю, гэта таксама сэнсарная, эмацыйная і нават фізічная нагрузка на чытача.*

Антаніна Морава ўзгадала вопыт Швецыі, дзе прынята дзяржаўная сацыяльная праграма, згодна з якой кожная раніца там пачынаецца з чытання газет і кніг. Яна заклікала падумаць над стварэннем падобнай праграмы і ў Беларусі.

### Мацярынства, выхаванне, сям'я

Гэтыя тэмы цесна пераплятаюцца ў адзіны «клубок», што завецца сацыяльна арыентаванай палітыкай дзяржавы, таму не дзіўна, што круглы стол пазіцыянаваўся таксама як падзея, што распачала шэраг мерапрыемстваў, прысвечаных Дню маці, які сёлета святкуецца цягам дзесяці дзён.

*— Сацыяльная тэма ўсе гады з'яўляецца адным з галоўных напрамкаў развіцця дзяржавы. Яна таксама блізкая кожнаму з нас. Шмат робіцца, каб словы «сацыяльна арыентаваная дзяржава» былі не толькі лозунгам, але і рэальнай паўсядзённай палітыкай па акцыяўленні гэтай задачы. І ў гэтым кірунку ёсць пэўныя дасягненні. Па развіцці чалавечага патэнцыялу наша краіна займае 53-ю пазіцыю ў свеце, а па спрыяльных умовах для мацярынства лідзіруе сярод краін СНД,* — выказалася **Лілія АНАНІЧ, міністр інфармацыі Беларусі.** *— Развіццё прапаганды чытання ў рэспубліцы праз праект «Сямейнае чытанне» — гэта таксама добрае пачынанне на шляху сацыяльнага развіцця дзяржавы.*

*— Сацыяльныя даследаванні, праведзеныя сярод моладзі ад 14 да 30 гадоў, паказваюць, што сям'я займае безумоўнае першае месца ў сістэме каштоўнасцей беларусаў,* — дадаў **Віктар ЯКЖЫК, намеснік міністра адукацыі Беларусі.** *— Я лічу дасягненнем і нашу сістэму дадатковай адукацыі, калі кожны школьнік мае магчымасць наведваць клуб па інтарэсах. Кожны год мы знаходзім новыя формы ўзаемадзеяння з бацькамі, часта яны самі праяўляюць ініцыятыву, прапануючы свае мерапрыемствы.*

Тэма сям'і непарыўна звязана з тэмай здароўя і медыцынскай дапамогі, даступнасць якой падкрэсліла **Алена БОГДАН, начальнік галоўнага ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя,** і прапанавала пачынаць кніжную адукацыю адразу па выхаду са сцен раддома.

*— Беларусь — трэцяя ў свеце сярод краін па даступнасці медыцынскай дапамогі пасля Канады і Брунея. Дзякуючы гэтаму, а таксама сістэме сацыяльных выплат цяжарным, у нас мала дачасных родаў — 3,9-4%, і нашу практыку матывавання жанчын пераймаюць іншыя краіны. У радзільных дамах мы праводзім акцыю «Нашы дзеці», у рамках якой дорым падарункі. Магчыма, сумесна з Саюзам пісьменнікаў і Саюзам жанчын можна было б стварыць тэматычнае выданне — «Мая першая кніга», якую матулі атрымлівалі б адразу пры выпісцы.*

*— Гаворачы пра Дзень маці, нельга было не закрануць яго духоўны складнік. Гэты дзень прымеркаваны да царкоўнага свята Пакроваў Найсвяцейшай Багародзіцы, абарона якой дапамагае нам выхоўваць дзяцей у багатым духоўна грамадстве,* — адзначыла **Надзея ЕРМАКОВА, намеснік старшыні Беларускага саюза жанчын.**

*— Сёння нікому ўжо не трэба тлумачыць ролю Дня маці ў жыцці людзей,* — сказала яна. *— Усе ўстановы старающа падрыхтавацца да гэтага свята, калі віншуюць таксама тых маці, якія дзяцей усынавілі. Я хачу пажадаць здароўя не толькі ўсім маці і іх дзецям, а найперш нашай агульнай і галоўнай матулі — Беларусі.*

**Ірына СІДАРОК**

■

■ Права голасу

# КАЛІ НЕ ХОЧАШ САЦЫЯЛЬНЫХ ВЫБУХАЎ — НА ВЫБАРЫ ТРЭБА ІСЦІ



**Вольга АБРАМАВА, дэпутат Вярхоўнага Савета XIII склікання, дэпутат Палаты прадстаўнікоў II і III склікання, палітолаг:**

— З пункту гледжання дзяржавы важна, каб людзі ўдзельнічалі ў выбарах, каб яны не адвыклі галасаваць. Гэта традыцыя, якая ў нашым грамадстве паходзіць з савецкага мінулага. Гэта пэўная ступень лаяльнасці ў дачыненні да дзяржавы і яе інстытутаў, іх падтрымка, незалежна ад палітычнага ладу. Калі чалавек ідзе на выбары — значыць, ён дэманструе сваю грамадзянскасць, у пэўнай ступені падзяляе думку пра тое, што ўсё арганізавана легальна. Значыць, чалавек лічыць, што нейкія асновы павінны быць. Інстытут выбараў — адна з асноў. Такі чалавек не падзяляе варыянт абнаўлення ўлады праз рэвалюцыю.

Беларусы, у большасці сваёй, аддаюць перавагу легальным спосабам дзеяння перад дэвіянтнымі. Мы гістарычна дастаткова законапаслухмяны народ, а выбары як палітычны інстытут адносяцца да сферы закону. Калі наша традыцыя ўдзелу ў галасаванні будзе страчана, то на дзяржаўным узроўні не застанецца нічога іншага, як знімаць планку яўкі на выбары. Калі выбіраюць тыя, хто лічыць патрэбным у гэтым удзельнічаць, астатнія нясуць цяжар адказнасці за сваю пасіўнасць і вымушаны жыць пры той уладзе, якую вызначаць актыўныя. Бо выбары ў сістэме з дэмакратычнымі падыходамі да галасавання — прамы шлях народа ўплываць на ўладу, вызначаць, хто і ў наступны тэрмін будзе збіраць з яго падаткі, распараджацца імі і ўладкоўваць жыццё ў краіне.

Калі людзі жадаюць мець змянняльнасць улады без сацыяльных выбухаў, то трэба ўдзельнічаць у выбарах. Якую б ацэнку ні давалі нашым выбарам, на іх, лічу, хадзіць трэба, бо яны маюць варыянты палітычных паводзін. На іх рэальна выказаць сваю волю. І гэта воля ў абавязковым парадку будзе вядома вышэйшаму кіраўніцтву краіны. Так або інакш, воля гэта можа паўплываць на курс, які праводзіць дзяржава.

Лічу, што забараняць заклікі да байкоту было залішнім. «Байкатысты» многія гады знаходзяцца ў своеасаблівым гета. Яны самаізалююцца. Пачынаючы з канца 1990-х—пачатку 2000-х, яны супрацьпастаўляюць сябе значнай частцы грамадства, якая прывыкла галасаваць. Зараз прыхільнікі байкоту ўспрымаюцца як прыхільнікі радыкалізму. Наша грамадства падобных лозунгаў не падтрымлівае.

# «ГЭТА НАША З ВАМІ КРАІНА»



**Святлана ГЕРАСІМОВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні:**

— Любая выбарчая кампанія заўсёды была і застаецца найважнейшым палітычным экзаменам у жыцці дзяржавы, свайго роду справаздачай аб дасягненнях і пераўтварэннях, накіраваных на паляпшэнне якасці жыцця людзей і грамадства ў цэлым.

Як старшыня пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі хачу сказаць, што за апошнія гады мы шмат чаго дасягнулі. У нас існуе моцная дзяржаўная ўлада, якой давярае народ, праводзіцца паслядоўная і незалежная палітыка, развіваецца эканоміка, грамадзянам аказваюцца неабходныя дапамога і падтрымка. Палітычны курс улады накіраваны на падтрыманне стабільнасці ў грамадстве, ва ўсіх сферах грамадскага жыцця: эканамічнай, сацыяльнай.

Я абавязкова пайду на выбары і ўпэўнена, што галасаваць пойдуць мае сваякі, сябры, калегі і знаёмыя. Для таго, каб наша будучыня была шчаслівай і паспяховай, нельга быць абыякавымі, бо гэта наша з вамі краіна! Я веру, што разам мы дасягнём яшчэ большага.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**
*medvedeva@zviazda.by*




Фота БЕЛТА.

■ Меркаванне

# ШТО ХАВАЕЦЦА ЗА ПРЫГОЖЫМІ СЛОВАМІ?



**Кампанія па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь амаль дасягнула свайго фіналу. Ужо стартавала датэрміновае галасаванне, а праз некалькі дзён Цэнтральная выбарчая камісія пачне абвяшчаць вынікі. Хутка і гэтыя выбары стануць гісторыяй, а дзяржава вернецца да жыцця ў звычайным рэжыме.**

Кандыдаты на галоўную пасаду ў краіне і іх каманды выкарыстоўваюць апошнія дні кампаніі, каб камунікаваць з выбаршчыкамі, даносіць да іх свае ідэі і прапановы, пераконваць у тым, што іх праграмы лепшыя за праграмы іншых кандыдатаў.

Гэта ў ідэале, гэтак павінна быць. Але ці назіраем мы з вамі такую барацьбу ідэй і праграм падчас сёлетніх выбараў?

Кожныя выбары, асабліва прэзідэнцкія, з'яўляюцца адлюстраваннем грамадскага жыцця і тых інтэлектуальных, ідэйных працэсаў, што ў ім адбываюцца. Таму і важна ацэньваць выбары не толькі па розных фармальных паказчыках: хто перамог, колькі працэнтаў галасоў атрымалі кандыдаты, якая была яўка і г.д. Для разумення таго, куды рухаецца краіна, якая будучыня ее чакае, неабходна звяртаць увагу на змест выбарчых кампаній, іх ідэйнае напаўненне. Кажучы навуковай мовай, важна рабіць кантэнт-аналіз таго, пра што гавораць палітычныя канкурэнты.

Хаця нярэдка можна пачуць меркаванне, што праграмы падчас выбараў нікога ўвогуле не цікавяць. Маўляў, хто іх чытае? І таму навошта над імі працаваць, калі можна проста «дзеля птушачкі» нешта там на паперцы надрукаваць і хай сабе ляжыць для значнасці. Калі раптам спатрэбіцца, то скажам, што вось яна — наша праграма, якую распрацоўвала вялікая каманда найлепшых прафесіяналаў.

Вельмі прыкра, што такое дзіўнае меркаванне ў нашым грамадстве сёння мае шырокае распаўсюджанне. Прынамсі, сярод саміх кандыдатаў, іх штабоў і рознага кшталту паліттэхнолагаў. Бо гэта не проста велізарная непавага да саміх сябе і сваіх выбаршчыкаў, але ж яшчэ і сапраўдная міна запаволенага дзеяння для будучыні краіны.

У 2010 годзе, падчас мінулай прэзідэнцкай кампаніі, Цэнтр аналітычных ініцыятыў «Ліберальнага клуба» рабіў адмысловае даследаванне, у якім аналізаваў змест праграм кандыдатаў і так званыя электаральныя меседжы. Іншымі словамі, тэзісы, якія прэтэндэнты на пасаду №1 даносілі да людзей і дзякуючы якім намагаліся пераадолець канкурэнтаў.

Па выніках даследавання мы тады падрыхтавалі аналітычную запіску, якую назвалі «Поснае начынне ў вострай абгортцы». Назва адлюстроўвала нашу галоўную выснову: нягледзячы на высокую эмацыянальнасць той кампаніі, самыя розныя падзеі падчас яе правядзення, так бы мовіць, «спецэфекты», змястоўна яна была вельмі бляклай. Праграмы ў абсалютнай большасці кандыдатаў былі надзвычай слабыя, а ў некаторых увогуле адсутнічалі.

Гэтым разам мы вырашылі такое даследаванне не праводзіць. Па-першае, таму што застаўся непрыемны асадак ад 2010 года і відавочна, што ніякіх пазітыўных зрухаў з ідэямі і праграмамі, з якімі кандыдаты ідуць да людзей, не адбылося.

Па-другое, на працягу 2011-2013 гадоў мы рабілі больш маштабнае даследаванне, у якім вывучалі эканамічныя праграмы абсалютна ўсіх палітычных суб'ектаў у Беларусі: зарэгістраваных і незарэгістраваных палітычных партый, рознага кшталту рухаў і аб'яднанняў, што не хаваюць сваіх палітычных амбіцый, а таксама органаў дзяржаўнага кіравання. Не буду падрабязна спыняцца на яго выніках, але ж выснова кожны раз атрымлівалася нават горшая, чым пры аналізе праграм кандыдатаў у 2010 годзе.

Толькі ўявіце: з недзе 25-30 палітычных суб'ектаў Беларусі нешта больш-менш падобнае да сапраўднай праграмы ёсць толькі ў чатырох-пяці.

Мы нават былі вымушаны канстатаваць: «Вынікі даследавання недвухсэнсоўна сведчаць пра тое, што галоўная праблема беларускай сучаснасці заключаецца ў катастрафічна нізкім узроўні інтэлектуальнага забеспячэння грамадска-палітычнага жыцця». Кажучы больш проста, у краіне няма паўнавартаснай дыскусіі паміж прадстаўнікамі розных ідэалогій і палітычных плыняў пра тое, як і ў якім кірунку мусіць развівацца Беларусь.

Няма такой дыскусіі таму, што ні дзяржава, ні апазіцыя асабліва не жадае яе развіваць. Кожны са сваіх прычын.

Ад прадстаўнікоў урада можна нярэдка пачуць, што яны не бачаць, з кім у апазіцыі можна сур'ёзна размаўляць на складаныя эканамічныя ці, напрыклад, знешнепалітычныя тэмы. І, сапраўды, у большасці выпадкаў гэта так і ёсць. А ад розных апазіцыйных структур звычайна чуеш, што сёння праграмы не з'яўляюцца для іх прыярытэтам: больш важна абараняць правы чалавека ці проста неяк выжываць у сітуацыі, калі ў грамадстве няма сур'ёзнай падтрымкі.

На жаль, натуральны вынік усяго гэтага мы пабачылі падчас і гэтай прэзідэнцкай кампаніі. Самы яскравы прыклад — тэлевізійныя дэбаты трох кандыдатаў. Не ведаю, як каму, а асабіста мне проста сорамна было іх глядзець. Гаворка нават не пра тое, што кандыдаты не маглі амаль нічога змястоўнага сказаць па сутнасці сваіх жа праграм. Гэта заўсёды можна спісаць на хваляванне ці фармат дэбатаў.

Але ж калі кандыдат на пасаду кіраўніка краіны не ведае розніцы паміж вывучаемымі ў школе паняццямі «датацыі» і «інвестыцыі», то гэта ўжо сапраўднае finita la comedia.

І можна з усяго гэтага, вядома, проста пасмяяцца. Дарэчы, шмат хто ў сацыяльных сетках ці прыватных размовах і робіць. Але ж хто тут з каго мусіць смяяцца? Хто ў выніку вінаваты ў такім стане грамадска-палітычнай дыскусіі?

Самае галоўнае: хто ад гэтага больш за ўсё пакутуе?

Адказ, на жаль, відавочны. Пакутуем усе мы, усё беларускае грамадства. І вінаваты ў такім стане грамадскай дыскусіі таксама мы ўсе разам, без выключэнняў.

І калі мы ўсё ж такі не хочам адмаўляцца ад нармальнай будучыні (а ў грамадства без асэнсаванай агульнай дыскусіі не можа быць напоўненай сэнсам будучыні), то з гэтай праблемай тэрмінова трэба нешта рабіць. Вось тут, а не на нейкіх штучных акцыях ці імпрэзах усе і мусяць дэманстраваць сапраўднае грамадскае лідарства. І патрабаваць такога ж лідарства і адказнасці ад усіх тых, хто ўдзельнічае ў палітычным жыцці Беларусі.

**Яўген ПРЭЙГЕРМАН,**
**дырэктар па даследаваннях Грамадскага аб'яднання «Дыскусійна-аналітычная супольнасць «Ліберальны клуб»**

■ Парламенцкі дзённік

## Старшыня Палаты прадстаўнікоў сустрэўся з алжырскім дыпламатам

# ВЫЙСЦІ НА НОВЫ ЎЗРОВЕНЬ

**Наша дзяржава разглядае Алжыр як важнага партнёра ў Паўночнай Афрыцы. На гэтым зрабіў акцэнт старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Андрэйчанка падчас сустрэчы з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Алжыра ў Расійскай Федэрацыі і Рэспубліцы Беларусь па сумяшчальніцтве Смаілам АЛАУА.**

Паводле слоў Уладзіміра Андрэйчанкі, нягледзячы на тое, што ў нашых краін невялікі ўзаемны тавараабарот (па выніках 2014 года ён склаў 10 мільёнаў долараў), ёсць вельмі вялікія перспектывы нарошчвання гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў паведаміў, што ў красавіку гэтага года адбыліся кансультацыі на ўзроўні намеснікаў міністраў замежных спраў, таксама прайшоў бізнес-форум. Па меркаванні Уладзіміра Андрэйчанкі, усе гэтыя сустрэчы стануць каталізатарам у актывізацыі двухбаковага супрацоўніцтва.

Гаворачы пра стан міжпарламенцкіх адносін, старшыня ніжняй палаты заўважыў, што ў беларускім парламенце ўжо створана 61 група сяброўства.

— Мы гатовы разгледзець пытанне аб стварэнні групы сяброўства ў нашым парламенце, калі з боку алжырскіх парламентарыяў будзе сустрэчная ініцыятыва, — адзначыў ён. — Мы хацелі папрасіць вас аказаць садзейнічанне ў фарміраванні гэтай групы.

У сваю чаргу Смаіл Алауа прызнаў, што міжпарламенцкая дыпламатыя адыгрывае асаблівую ролю ў двухбаковых стасунках.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

# НА СУВЯЗІ — УЛАДА

**10 кастрычніка ва ўсіх рэгіёнах краіны прадстаўнікі аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама працягнуць кантактаваць з насельніцтвам. Канструктыўны дыялог у выглядзе прамых тэлефонных ліній існуе ўжо больш за паўгода. Званкоў у апошні час становіцца ўсё менш, як адзначаюць чыноўнікі, і гэта — найлепшы паказчык работы.**

Жыхары могуць звярнуцца да ўлады і ў гэтую суботу, 10 кастрычніка, с 9.00 до 12.00. Тэлефонныя лініі правядуць:

**Брэсцкі аблвыканкам**
намеснік старшыні ЦУПРЫК Леанід Аляксандравіч (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам**
першы намеснік старшыні ГРАБНЁЎ Генадзь Іванавіч (80212204260);

**Гомельскі аблвыканкам**
першы намеснік старшыні МАКСІМЕНКА Аляксандр Уладзіміравіч (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ЛІСКОВІЧ Віктар Андрэевіч (80152735644);

**Мінскі аблвыканкам**
намеснік старшыні НЕЎМЯРЖЫЦКІ Сяргей Пятровіч (80175004160);

**Магілёўскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ХАРЫТОНЧЫК Дзмітрый Іванавіч (80222501869);

**Мінскі гарвыканкам**
намеснік старшыні КАРПЕНКА Ігар Васільевіч (80172224444).

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
8 КАСТРЫЧНІКА 2015 г.
ЧАЦВЕР
№ 20 (15779)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

Віталь КАРПАНАЎ:

# «Люблю атмасферу вёскі»



**Гурт «Дразды» не зблытаеш з іншымі, бо там, дзе ён з'яўляецца, гучыць толькі жывая музыка, не спыняюцца жарты і танцы. Хлопцы не растрацілі свайго творчага запалу! Запісваюць песні, гастралююць, здымаюць кліпы, іх графік выступленняў распісаны... Як прызнаецца фронтмен калектыву Віталь Карпанаў, сакрэт просты — трэба жыццё ўспрымаць, як «хвалі», і ніколі не апускаць рук. Напярэдадні святкавання юбілею групы ён падзяліўся з намі разважаннямі пра папулярнасць, любоў да беларускай вёскі і шкоднасць адпачынку.**

***— Віталь, сёлета гурт «Дразды» адзначае дзесяцігоддзе. Можна сказаць, што за гэты час ён стаў брэндам на нашай эстрадзе?***

— Гэтае адчуванне з'явілася зусім нядаўна, недзе год таму. Добра памятаю, як, адзначалі наш пяцігадовы юбілей: святам тую падзею можна было лічыць з нацяжкай. Стан такі, калі святкуеш, аднак разумееш, што не дарос, не заслужыў. А цяпер я ўпэўнены, што мы маем для свята ўсе падставы. Ёсць песні, канцэрты, прыхільнікі... Магчыма, іх не так шмат, як у іншых артыстаў, але яны ёсць. І гэта з'яўляецца падмуркам нашага існавання.

***— Пачыналася ўсё з конкурсу «Пяць зорак» — у Сочы вы занялі трэцяе месца. Якім запомнілі той час?***

— Група з'явілася недзе на год ці два раней, але пунктам «адліку», лічым, стаў менавіта той конкурс... Нас паказвалі па тэлебачанні, і ўжо не трэба было (як рабілі тое раней) насіць свае песні на радыё. Нам самі тэлефанавалі і прасілі даць музычны матэрыял. Гурт хацелі слухаць. І тады я адчуў, што шоу-бізнес — гэта тое, чым я хачу займацца. Бывае ж, ты ідзеш да нечага, укладаеш сілы, а потым разумееш — не тое. А тут усё адбылося якраз наадварот: я паверыў у сябе і ў тое, што ўсе мае крокі былі недарэмнымі, нам удалося дабіцца выніку. Мы знайшлі тое, чым маглі і хацелі зарабляць сабе на жыццё.

***— І ад поспеху закружылася галава?***

— Пасля перамогі на конкурсе было дваістае адчуванне. З аднаго боку, разумелі: калі нам прысудзілі трэцяе месца — значыць, мы нечага вартыя. А з другога было ўсведамленне, што спаборніцтва скончылася, узнагароду атрымалі, і што цяпер? Ад такіх думак станавілася страшна. Тады я недзе каля года змарнаваў на «рэабілітацыю» ад стрэсу. Песні амаль што не пісаў. Але з часам усё ж паразумнеў і ўцяміў, што выйсце было толькі адно: трэба працаваць, зноў даказваць, чаго мы вартыя.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Тэкстура таленту

# Яе называюць сталяром,

## а яна проста любіць пах драўніны

**Што, цікава, адчуў бы хлопец, калі на спатканні дзяўчына замест памады ці тушы дастала б з сумачкі... набор стамесак? Такая сітуацыя гіпатэтычна магла б адбыцца з 20-гадовай Дзіянай ФІЛІПЧЫК: дзяўчына займаецца не самай звычайнай для «слабага полу» справай — мастацкай апрацоўкай дрэва. Пра свае захапленне юная рамесніца распавяла «Чырвонцы. Чырвонай змене».**

— Насамрэч з дрэва можна зрабіць неверагодна шмат прыгожых і карысных рэчаў, — расказвае Дзіяна, раскладаючы на стале некаторыя са сваіх работ. — Вось, напрыклад, цукерніца, якой мы звычайна карыстаемся дома. Ці вось яшчэ — падстаўка для ручак і алоўкаў. Зручна — заўсёды ёсць магчымасць сваімі рукамі зрабіць нешта для інтэр'ера на свой густ. Ды і над пошукам падарункаў для сяброў я звычайна не доўга не думаю *(смяецца)*.

Дзіяна, як хірург, акуратна раскладвае на стале свае інструменты: стамескі, долаты розных формаў і памераў. Адначасова дзяўчына ўзгадвае, як зразумела, што хоча займацца менавіта рамесніцтвам. Цяга да творчасці з'явілася ў дзяцінстве, калі яна вучылася ў мастацкай школе.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*



Фота Надзеі БУЖАН.

Прафарыенцір

# ВЫШЭЙШАЯ АДУКАЦЫЯ — ЛЮБОЙ ЦАНОЙ,

## або За якімі прафесіямі будучыня?

**У многіх краінах свету распаўсюджванне вышэйшай адукацыі разглядаецца як прыярытэтная задача на дзяржаўным узроўні. У Еўрасаюзе імкнуцца да таго, каб да 2020 года ў кожнай дзяржаве, што ўваходзіць у яго, 40% маладых людзей ва ўзросце ад 30 да 34 гадоў мелі б вышэйшую адукацыю. ЗША ставяць за мэту да 2020 года дасягнуць пазіцыі сусветнага лідара па колькасці выпускнікоў каледжаў, а для гэтага іх лік да канца дзесяцігоддзя павінен павялічыцца ў нацыянальным маштабе на 50%.**



Фота Надзеі НІКАЛАЕВАЙ.

### ДЫПЛОМ ЦІ ВЕДЫ?

У эпоху «эканомікі, заснаванай на ведах» шырокае распаўсюджанне вышэйшай адукацыі цяжка назваць нечаканасцю. Разам з тым узнікае шэраг заканамерных пытанняў. Наколькі павелічэнне працоўных рэсурсаў з вышэйшай адукацыяй будзе адпавядаць патрэбам рынку працы? І якія магчымасці для працаўладкавання будуць у выпускнікоў устаноў вышэйшай адукацыі?

За апошняе дзесяцігоддзе густы ў моладзі мала змяніліся: гуманітарныя, сацыяльныя навукі і юрыспрудэнцыя карыстаюцца значна большай папулярнасцю ў параўнанні з прыродазнаўчымі навукамі, тэхналогіямі, інжынерыяй і матэматыкай (STEM-адукацыя). А ў некаторых краінах выпускнікоў вышэйшых навучальных устаноў, якія спецыялізуюцца на гэтых навуках, прыблізна ўтрая больш, чым выпускнікоў сферы STEM.

Міжнародныя эксперты канстатуюць, што фармальны факт атрымання вышэйшай адукацыі яшчэ зусім не азначае якасці набытых навыкаў. Згодна з міжнародным даследаваннем, фактычны ўзровень ведаў і навыкаў уладальнікаў дыпломаў аб вышэйшай адукацыі істотна адрозніваецца ад таго, што змяшчаецца ў кваліфікацыйных патрабаваннях. Даследаванне ўключала ў сябе ацэньванне наступных кампетэнцый: разуменне пісьмовых тэкстаў, матэматычную адукаванасць, рашэнне задач у тэхналагічна насычаным асяроддзі. Цікава, што ў Японіі і Нідэрландах маладыя людзі ва ўзросце ад 25 да 34 гадоў прадэманстравалі больш высокі ўзровень разумення пісьмовых тэкстаў у параўнанні з выпускнікамі ніжэйшых навучальных устаноў Італіі і Іспаніі той жа ўзроставай групы. У Расіі асобы з вышэйшай адукацыяй паказалі ніжэйшыя вынікі, чым у сярэднім па краінах Арганізацыі эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця (АЭСР), а людзі з сярэдняй прафесійнай адукацыяй — наадварот, больш высокія.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
08 10 2015 г.

# ВЫШЭЙШАЯ АДУКАЦЫЯ — ЛЮБОЙ ЦАНОЙ

## «ЛІШНІЯ» СТУДЭНТЫ

Па колькасці студэнтаў у разліку на 10 тысяч насельніцтва Беларусь мела ў 2013/2014 навучальным годзе самы высокі паказчык сярод краін СНД — 417 студэнтаў. Рэкордная колькасць студэнтаў была ў нас у 2011 годзе — 445 600 чалавек. Але затым гэта лічба пачала імкліва зніжацца ў сілу дэмаграфічных прычын. Праўда, колькасць месцаў у ВНУ (як на платнай, так і на бюджэтнай форме навучання) скарачалася больш марудннымі тэмпамі, чым колькасць выпускнікоў школ, таму стаць студэнтам стала зусім проста. Напрыклад, прыватныя ўстановы вышэйшай адукацыі выканалі план прыёму сёлета толькі на 46,3%. Фактычна адзіным рэгулятарам масавасці і ўсеагульнай даступнасці вышэйшай школы застаецца мінімальны парог на цэнтралізаваным тэсціраванні — не пераадолеўшы яго, замахнуцца на званне студэнта праблематычна. Але для другой профільнай дысцыпліны парог на ЦТ усё ж такі быў у гэтым годзе зніжаны, што спрасціла слаба падрыхтаваным абітурыентам задачу...

Ёсць у нашай вышэйшай школы і яшчэ адна характэрная адметнасць — каля паловы ад агульнай колькасці беларускіх студэнтаў атрымліваюць вышэйшую адукацыю на завочнай форме навучання. А да якасці ведаў завочнікаў ёсць прэтэнзіі.

Калі ж паглядзець на прыхільнасці моладзі, то ў трэндзе ў беларускіх абітурыентаў (як і ў маладых еўрапейцаў) гуманітарныя спецыяльнасці, IT-сфера, правазнаўства і медыцына. У Беларускім дзяржаўным універсітэце на некаторых спецыяльнасцях сёлета былі зафіксаваны проста фантастычныя прахадныя балы. На спецыяльнасці «міжнароднае права» — 383, «журналістыка (аўдыявізуальная)» — 382, «міжнародныя адносіны» — 378, на «сусветнай эканоміцы» — 367, на спецыяльнасці «эканамічнае права» — 362, «менеджмент (напрамак — менеджмент у сферы міжнароднага турызму)» — 358, «лінгвакраіназнаўства» — 377.

На сённяшні дзень прыкладна два дзясяткі беларускіх ВНУ рыхтуюць студэнтаў па аналагічных спецыяльнасцях, такіх, напрыклад, як «фінансы і крэдыт», «бухгалтарскі ўлік, аналіз і аўдыт» і іншых. Таму выказваюцца прапановы «інвентарызаваць» падрыхтоўку спецыялістаў па некаторых масавых прафесіях у асобных рэгіёнах і ВНУ — так бы мовіць, адпаведна патрэбам. Тым больш, што ў эканоміцы Беларусі колькасць працоўных месцаў для людзей з вышэйшай адукацыяй складае толькі 27,4% ад агульнай.

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ПАТРАБУЮЦЦА ІНЖЫНЕРЫ

Паколькі наша краіна з'яўляецца экспартна арыентаванай, то для Беларусі выключна важнае значэнне мае тэхнічная адукацыя. Патрэба ў высокакваліфікаваных спецыялістах расце, а патрабаванні да ведаў і прафесійных навыкаў становяцца ўсё больш жорсткімі. На шчасце, у апошнія гады вяртаецца цікавасць з боку беларускай моладзі да вышэйшай тэхнічнай адукацыі. Аднак выкладчыкі канстатуюць, што абітурыенты тэхнічных ВНУ менш ведаюць пра выбраную спецыяльнасць, чым нацэленыя на паступленне ў медыцынскія, педагагічныя, сельскагаспадарчыя і творчыя ВНУ. Яны не могуць ацаніць уласныя здольнасці да інжынерна-тэхнічнай дзейнасці і маюць вельмі аддаленае ўяўленне пра будучую прафесію.

**Прыватныя ўстановы вышэйшай адукацыі выканалі план прыёму сёлета толькі на 46,3%.**

Гучала прапанова вызначыць аптымальную прапорцыю ў размеркаванні студэнтаў па канкрэтных галінах навучання: гуманітарныя навукі, тэхнічныя, прыродазнаўча-навуковыя, эканамічныя і гэтак далей. Толькі якой павінна быць гэта прапорцыя? У Фінляндыі штогод выпускаецца на 1 тысячу насельніцтва 17,4 інжынера, у Швецыі — 17, у Сінгапуры — 16,8, а ў Беларусі — 7. Але да вызначэння тэмпаў росту падрыхтоўкі спецыялістаў па тэхнічных і прыродазнаўча-навуковых напрамках і профілях патрабуюцца навукова абгрунтаваныя падыходы.

## БУДУЧЫЯ «ПЕНСІЯНЕРЫ»

Складана прадказаць, якія кампетэнцыі і навыкі будуць запатрабаваны, напрыклад, праз 10-20 гадоў. У Расіі абяцаюць у кастрычніку апублікаваць даведнік запатрабаваных на рынку працы, а таксама новых і перспектыўных прафесій. Сёння ў дзясятцы самых высокааплатных спецыяльнасцяў у Расіі 8 пазіцый займаюць "тэхнары". Пры гэтым амаль кожны другі непрацаўладкаваны выпускнік мае юрыдычную або эканамічную адукацыю.

Напрыклад, перспектыўнай для рынку працы лічыцца прафесія мехатроніка — спецыяліста, які валодае ведамі на стыку механічных і электронных прылад. Ключавая роля на рынку працы належыць праграмістам, распрацоўшчыкам мультымедыйных праграм, спецыялістам у сферы мабільнай робататэхнікі і зборшчыкам электронных сістэм. Актыўна развіваецца сфера тэлекамунікацый. Але і без цырульнікаў і кухараў пакуль таксама немагчыма абысціся: прафесіі, звязаныя са сферамі харчавання і абслугоўвання, востра запатрабаваны наймальнікамі.

Міжнародная практыка сведчыць, што базу прафесій трэба абнаўляць прыкладна раз на дзесяцігоддзе: за кошт прарыву ў сферы тэхналогій яна можа змяніцца на 10-20 працэнтаў.

Працэс выхаду прафесіі «на пенсію» адбываецца паступова: спачатку з'яўляюцца «першыя ластаўкі» ў выглядзе эксперыментаў па замене прафесій новымі тэхналагічнымі рашэннямі (найбліжэйшыя 5 гадоў), затым працэс становіцца масавым (наступныя 10-15 гадоў), а яго заканчэнне можа расцягнуцца на дзесяцігоддзі. Экзатычнай прафесіяй можна лічыць, напрыклад, сушыльшчыкаў чаю, але ў Краснадарскім краі такія спецыялісты пакуль запатрабаваныя.

Ёсць меркаванне, што некаторыя прафесіі пакінуць рынак пад ціскам аўтаматызаваных і робатызаваных сістэм і першымі пачнуць знікаць тыя, якія прасцей за ўсё аўтаматызаваць, а таксама прафесіі, сутнасць якіх заключаецца ў пасрэдніцтве паміж рынкам і спажыўцом тавараў і паслуг. Пад пагрозай знікнення знаходзяцца стэнаграфісты, капірайтары, тураґенты, лектары, бібліятэкары і архіварыусы, білецёры, паркоўшчыкі, выпрабавальнікі, апаратары call-цэнтра, ліфцёры і паштальёны.

*Рэйтынгі*

# БДУ працуе над дзелавой рэпутацыяй

**Брытанскае спецыялізаванае выданне THE апублікавала рэйтынг 800 найлепшых універсітэтаў свету Times Higher Education World University Rankings. Белдзяржуніверсітэт стаў адзінай айчыннай ВНУ, якая за ўсю 12-гадовую гісторыю існавання рэйтынгу трапіла ў лік размеркаваных па ранжыру і заняла месца ў групе 601-800.**



Фота Надзеі БУЖАН.

Рэйтынг рыхтуецца вядомым брытанскім часопісам Times Higher Education (THE) і лічыцца адным з найбольш прэстыжных і надзейных рэйтынгаў універсітэтаў свету.

У рэйтынг 2015-2016 года ўключаны вынікі ацэнкі дзейнасці 800 самых лепшых універсітэтаў. Сярод крытэрыяў ацэньвання вылучаюцца наступныя блокі: адукацыйная дзейнасць (удзельная вага ў агульнай ацэнцы 30%), навуковыя даследаванні (30%), цытаванасць навуковых прац (30%), міжнародное супрацоўніцтва (7,5%) і інвестыцыі бізнесу ў навуковую дзейнасць (2,5%). Важнае значэнне мае акадэмічная і даследчая рэпутацыя ўніверсітэта (аналізуюцца вынікі апытання больш як 11 тысяч экспертаў). Пад увагу бяруцца таксама суадносіны колькасці студэнтаў і выкладчыкаў, падрыхтоўка кадраў вышэйшай кваліфікацыі (кандыдатаў і дактароў навук) і многія іншыя параметры.

«Рэйтынг Times Higher Education World University Rankings заўсёды ўважліва і акуратна падыходзіць да стандартаў ацэнкі і прымяняе да ўсіх адзіныя жорсткія нормы ацэньвання, — падкрэслівае рэдактар рэйтынгу THE Філ Бэйці. — Вынікам нашага рэйтынгу давяраюць студэнты, іх бацькі, прадстаўнікі акадэмічнай сферы, кіраўнікі ўстаноў вышэйшай адукацыі і міністэрстваў. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, які ўпершыню заняў месца ў групе 601-800 найлепшых універсітэтаў свету, можа ганарыцца сваімі выдатнымі дасягненнямі».

На верхнім радку рэйтынгу размясціўся Каліфарнійскі інстытут тэхналогій, за ім ідзе Оксфардскі ўніверсітэт, а замыкае тройку лідараў Стэнфард.

З нашых суседзяў у рэйтынгу THE 2015-2016 года вышэйшыя за Белдзяржуніверсітэт пазіцыі маюць восем расійскіх ВНУ: Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт (161-я пазіцыя), Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны політэхнічны ўніверсітэт (201—250), Томскі політэхнічны ўніверсітэт (251—300), Казанскі федэральны ўніверсітэт (251—300), Нацыянальны даследчы ядзерны ўніверсітэт МІФІ (301—350), Новасібірскі дзяржаўны ўніверсітэт (401—500), Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны ўніверсітэт (401—500), Маскоўскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя Баўмана (501—600), а таксама Варшаўскі ўніверсітэт (501—600).

У адной групе з БДУ аказаліся Кіеўскі нацыянальны ўніверсітэт імя Тараса Шаўчэнкі і Вільнюскі ўніверсітэт. Яны, таксама як і БДУ, адзіныя прадстаўнікі ад сваіх краін, якія трапілі ў брытанскі рэйтынг.

*Крок да самастойнасці*

# БІЗНЕС ЗА ШКОЛЬНАЙ ПАРТАЙ

**З пачаткам новага навучальнага года ва ўстановах адукацыі Мінскай вобласці распачалося фарміраванне школьных бізнес-кампаній. Асноўныя напрамкі іх дзейнасці — раслінаводства, выраб сувенірнай і паліграфічнай прадукцыі, аказанне камп'ютарных паслуг, пашыў вырабаў. Таксама юныя прадпрымальнікі могуць арганізоўваць святы для дзяцей, ствараць відэаролікі і мультымедыйныя прэзентацыі, аказваць адукацыйныя і бытавыя паслугі.**

Асаблівую папулярнасць у апошні час набываюць школьныя бізнес-кампаніі турыстычнай і экскурсійнай накіраванасці. Вучні распрацоўваюць маршруты, складаюць пералікі прыродных аб'ектаў і гістарычных месцаў, якія могуць быць выкарыстаны для правядзення паходаў і экскурсій.

У папярэднім навучальным годзе ў Мінскай вобласці функцыянавала 101 школьная бізнес-кампанія (для параўнання: у снежні 2011 года іх было ўсяго чатыры), дзе былі задзейнічаны 855 навучэнцаў. Найбольшая колькасць школьных бізнес-кампаній была створана ў Маладзечанскім (23), Дзяржынскім (21), Мінскім (11) і Салігорскім (9) раёнах.

Як правіла, школьная бізнес-кампанія функцыянуе на працягу аднаго навучальнага года. Самі школьнікі вызначаюць яе структуру, распрацоўваюць стратэгію развіцця бізнесу, размяркоўваюць пасады, вядуць справаводства і бухгалтэрыю. Перш чым прыступіць да працы, праводзяцца маркетынгавыя даследаванні, распрацоўваецца бізнес-план, арганізуецца рэкламная кампанія. Вучні выпрацоўваюць і рэалізуюць прадукцыю, рыхтуюць неабходныя справаздачныя і фінансавыя дакументы. Кожная школьная бізнес-кампанія выплачвае падаткі дзяржаве і заработную плату сваім супрацоўнікам.

Праекты па развіцці прадпрымальніцтва актыўна рэалізуюцца і ва ўстановах прафесійнай адукацыі Мінскай вобласці. Так, у Барысаўскім дзяржаўным каледжы галіновых тэхналогій створана вучнёўская бізнес-кампанія «Антураж», у склад якой уваходзяць цырульня, майстэрня па пашыве і рамонце адзення, магазін па рэалізацыі швейных вырабаў і стол заказаў.

Матэрыялы паласы падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА. nikalaeva@zviazda.by

Вас пачулі!

# КАЛІ ПРАПАЎ ЧАЛАВЕК...

## на дапамогу прыходзіць «Анёл»

**Анёл... Напэўна, гэтае слова ў большасці атаясамліваецца з нечым светлым, добрым, тым, што прыносіць надзею. Таму не дзіва, што першы пошукава-выратавальны атрад у Беларусі атрымаў менавіта такую назву. За тры гады дзейнасці да «Анёла» з просьбай дапамагчы ў пошуках звярнуліся каля дзвюх з паловай тысяч чалавек. Многія валанцёры ўзнагароджаны граматамі, дыпломамі, а камандзіру Сяргею КОЎГАНУ міністр унутраных спраў у 2013 годзе ўручыў медаль «За садзейнічанне».**

— Ідэя стварыць валанцёрскі атрад узнікла, калі аднойчы па тэлебачанні пачуў: адна жанчына просіць дапамагчы адшукаць яе знаёмага, які заблукаў у лесе, — расказвае Сяргей. — Мяне тады здзівіла, што адгукнуліся толькі я і мой сябар. Вось тады і падумаў: магчыма, людзі і хочуць дапамагчы, але не ведаюць, як гэта зрабіць. Таму ў чэрвені 2012 года пачаў дзейнічаць валанцёрскі атрад «Анёл». Стварылі групы ў сацыяльных сетках, куды далучалася ўсё больш і больш валанцёраў. А праз два дні паступіла першая заява на пошук дзяўчыны.

Далей размову працягвае **Юлія КОЎГАН, інфармацыйны адміністратар і каардынатар валанцёраў.**

— Атраду былі патрэбны адміністратары ў сацыяльных сетках — я і стала «анёлам». Пішу лістоўкі, каардыную дзейнасць валанцёраў, удзельнічаю ў пошукавых мерапрыемствах, — дзеліцца Юлія. — «Анёлам» можа стаць кожны ахвотны. Праўда, далучыцца да пошукаў у лесе — толькі паўналетні валанцёр. У розных сацыяльных сетках даём арыенціроўкі: дзе, калі збіраемся, колькі чалавек патрэбна і гэтак далей. Часам «Анёл» правodзіць рэспубліканскія вучэнні па пошуку прапаўшых у лесе. Валанцёраў вучаць, як карыстацца компасам, перадаваць паведамленні па радыёсувязі, як правільна аказваць першую медыцынскую дапамогу і шмат чаму іншаму, што неабходна ведаць пошукавіку. Але гэта — мінімум, якога, як паказвае практыка, у некаторых выпадках можа быць недастаткова. І членам атрада, і знойдзеным людзям, і іх сем'ям патрэбна псіхалагічная рэабілітацыя. Таму ў атрадзе ёсць свой псіхолаг Кацярына Іванова. Яна дапамагае «разгрузіцца» пасля складаных пошукаў, раіць, як лепш размаўляць з роднымі тых, хто прапаў.

***— Юлія, вы атрымалі паведамленне: прапаў чалавек. Вашы дзеянні?***

— Інфармацыю можна пакінуць на нашым сайце (angel-search.by). Зразумела, што мы супрацоўнічаем з міліцыяй. Адразу ж правяраем, і калі пацвярджаецца, што чалавек лічыцца прапаўшым, пачынаем працу. На сёння ў нас каля 100 пастаянных валанцёраў. Да пошукаў далучаюцца і новыя людзі. У лясныя масівы выязджаюць ад 10 да 30 чалавек. У выхадныя дні, зразумела, добраахвотнікаў больш. Але нават калі ахвотныя дапамагчы размесцяць інфармацыю пра чалавека, якога шукаюць, на сваёй старонцы ў сацыяльнай сетцы альбо нават на машыне ці расклеяць лістоўкі — гэта ўжо велізарная дапамога. І, ведаеце, гэта так цудоўна, калі потым на лістоўцы пазначана вялікімі чырвонымі літарамі — «Знойдзены!».

***— Што патрэбна для пошуку?***

— У лесе — навігацыя, радыёсувязь, сістэмы апавяшчэння, якія падаюць моцны гукавы сігнал на працягу доўгага часу і дапамагаюць зарыентавацца тым, хто заблукаў. Нядаўна мы пачалі супрацоўнічаць з клубам дайвінгу «Капітан Морган». Напрыклад, для правядзення пошукавых мерапрыемстваў каля вадаёмаў ці непасрэдна на вадзе неабходна маторная лодка, якой, на жаль, у нас пакуль няма. А для бяспечнай працы валанцёраў на вадзе — надзіманыя камізэлькі. Мы не камерцыйная арганізацыя, таму сродкаў на набыццё тэхнічных прыстасаванняў часам не хапае. Удзельнічаем у розных конкурсах, акцыях, сацыяльных праектах, а выйгрышы ідуць на набыццё тэхнікі. Нешта валанцёры купляюць і за ўласныя сродкі.

***— Парайце, як дзейнічаць, калі прапаў чалавек?***

— Патэлефанаваць у бюро рэгістрацыі няшчасных выпадкаў ГУУС Мінгарвыканкама (8 017 390 01 99 або 390 02 81). Туды паступае ўся інфармацыя з моргаў, бальніц і пра дарожна-транспартныя здарэнні. Пасля неадкладна падаць заяву ў міліцыю. Не трэба чакаць трох сутак, каб распачаць пошук, як лічаць некаторыя. А затым можна звярнуцца ў наш атрад, каб мы дапамаглі з пошукам (+375 33 666 68 56).



**Юлія БУКЕЛЬ,**
**студэнтка V курса Інстытута журналістыкі БДУ.**

Будзь актыўным!

# УЛЮБЁНАЯ Ў СВАЮ СПРАВУ

**Алеся Зубок не ўяўляе сабе жыцця без... Студэнцкага гарадка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта: удзельнічае ў студэнцкім і каардынацыйным саветах, а таксама савеце па прафілактыцы парушэнняў правілаў пражывання ў студэнцкіх інтэрнатах БДУ, грамадскай інфармацыйнай службе...**



***— Ці думала ў дзяцінстве, што станеш лідарам?***

— Памятаю, што была не ў меру актыўным дзіцем. Не магла сядзець ніводнай хвіліны на месцы, але як толькі навучылася чытаць, захапілася кнігамі. Здаралася, я некалькі разоў на дзень хадзіла ў бібліятэку. Кнігі падарылі мне веру ў людзей, надзею на сапраўдне сяброўства і навучылі дабрыні. Адным словам, выхавалі ўва мне лідара.

***— У якіх студэнцкіх праектах прымала ўдзел?***

— Іх было вельмі шмат, раскажу пра некаторыя. «Дзень студэнта» — мерапрыемства, якое арганізоўваў і праводзіў БРСМ філалагічнага факультэта. «Бітва факультэтаў» — традыцыйнае мерапрыемства для першакурснікаў у нашым інтэрнаце. Кожны факультэт выстаўляў каманду, якая рыхтавала творчы нумар. Самым карысным праектам быў «Дабрачынны кірмаш». Сэнс у чым? Студэнты прадавалі традыцыйныя ласункі розных краін, розныя вырабы ручной працы. Кірмаш праходзіў адначасова ва ўсіх інтэрнатах БДУ, а ўсе выручаныя грошы пайшлі на куплю падарункаў для школы-інтэрната.

Тады нашай базай стаў сталічны інтэрнат №4. Мы разам з яго выхаванцамі стваралі нумары для вялікага валанцёрскага канцэрта. На працягу паўгода я ездзіла на рэпетыцыі, вучыла дзяцей не баяцца выступаць перад людзьмі, дыкцыі, майстэрству дэкламавання вершаў. Вядома, гэта было нялёгка, таму што да кожнага трэба было знайсці свой падыход. Але ў нас усё атрымалася.

***— Чым табе найперш падабаецца праца ў студэнцкім савеце?***

— З кожным днём я разумела, што студсавет — гэта ўжо не проста арганізацыя, а стыль жыцця. Часта дзеля імпрэз, сходаў даводзілася прапускаць заняткі, забыцца на асабістае жыццё, бо для мяне студсавет стаў усім. Вельмі ўдзячна выкладчыкам філфака БДУ, бо яны з разуменнем ставяцца да маёй дзейнасці, а гэта самае галоўнае.

***— Што робіш у вольных хвіліны?***

— Вось пайшла ў Чырвоны Крыж, каб атрымаць новы досвед і неабходныя веды для прафесійнай валанцёрскай дзейнасці, ёсць жаданне ездзіць да малых у дом дзіцяці №2.

***— Чым думаеш заняцца пасля заканчэння вучобы?***

— Хачу дасягнуць найвышэйшага ўзроўню кампетэнтнасці ў сферы валанцёрства.

***— У цябе ёсць мары?***

— Вядома, як без іх? Але яны зусім звычайныя. Мару пра цікавую працу пасля ўніверсітэта, пра вялікую сям'ю (хачу стаць шматдзетнай маці) і добры ўтульны дом. Але асабліва хачу, каб мае бацькі менш працавалі і ўу іх была магчымасць часцей адпачываць.

**Настасся ЖУХАРАВА,**
**студэнтка IV курса Інстытута журналістыкі БДУ.**

Профіль у сеціве

# ЦІ ДАВЯРАЦЬ «ГУГЛУ» АСАБІСТАЕ?

**Свет, у якім «каменціць/ посціць/лайкнуць» стала эквівалентам «разумнага, добрага, вечнага», складана ўявіць без форумаў і сацыяльных сетак. А калі ў вас няма прыватнай старонкі «УКантакце», здзіўленыя позіркі знаёмых прымусяць шукаць апраўданне. Вось і суседка па лесвічнай клетцы, ускідаючы бровы, пытаецца: «Няўжо табе не хочацца дзяліцца навінамі з сябрамі, карыстаючыся інтэрнэтам? Гэта ж так проста і зручна! Дарэчы, мая ўнучка шукала твой акаўнт, але чамусьці не знайшла. Можа, ноўтбук зламаўся ці прозвішча ты змяніла?..»**

Пытанне застаецца без адказу: нялёгка растлумачыць размоўцы, што з камп'ютарам усё добра, а весь жаданне выносіць прыватнае на віртуальную «сцяну» не назіраецца.

У школьныя і студэнцкія гады мая абыякавасць да сацыяльных сетак выклікала асаблівую цікавасць сярод аднагодкаў. Вострыя на выказванні, яны без стомы пляткарылі пра анлайн-неадукаванасць дзяўчыны-падлетка альбо карэктна намякалі на «цяжкае дзяцінства», якое быццам наклала на мяне відавочны адбітак. Дзякуй, што цяпер не прыходзіцца тлумачыць пра наяўнасць/адсутнасць асабістай старонкі ў сеціве: адны ўпэўнены, што замяніць камунікацыю пад грыфам «тэт-а-тэт» сучасным тэхналогіям не пад сілу, іншыя, сутыкнуўшыся з «хараством» інтэрнэт-стасункаў, выдаляюць прыватныя профілі. Дарэчы, апошні варыянт набірае абароты, бо засакрэнелыя карыстальнікі рэдка задумваюцца аб асабістай бяспецы, аддаючы перавагу захоўванню інфармацыі пад кволым шчытом з надпісам «раптам».

Зрэшты, бясконцыя ліхтугі на віртуальных падмостках наўрад ці зменяць настрой людзей. Вось і знаёмы пасля ўзлому свайго акаўнта паспяшаўся выдаліць сапсаваныя фотаздымкі. Але не прайшло і тыдня, як гаспадар старонкі аднавіў профіль, — зноў калекцыянуе каментары сяброў-прыяцеляў...

Аднак нечаканасці здараюцца не толькі з карыстальнікамі сацыяльных сетак. Не сакрэт, што колькасць інфармацыі ў свеце павялічваецца з неймавернай хуткасцю. Мы адпраўляем электронныя лісты, каментуем навіны, размяшчаем здымкі — і невыпадкова ўсеабдымны «Гугл» ведае пра нас больш за блізкіх і родных.

Безумоўна, стараешся не думаць, што кожны ахвотны без аніякіх цяжкасцяў можа скласці партрэт любой асобы на падставе прымітыўнага запыту. Вось чаму баразніць інтэрнэт-абшары лепш за ўсё падрыхтаванаму карыстальніку, які разумее, хто і ў якіх мэтах бярэ на ўзбраенне вашу прыватную інфармацыю.

Мабыць, прыйшоў час падумаць пра асабістую бяспеку? Няхай на старонках у сеціве зноў з'яўляюцца фотаздымкі з Гаа, Баа і іншыя падрабязнасці. Але майце на ўвазе: калі пошукавая сістэма яшчэ не вывучыла вас ад «А» да «Я», то сцежку-дарожку да «У» яна ўжо дакладна праклала.

**Карына ЦІМАФЕЕВА.**

Лад жыцця

# МОЛАДЗЬ ГАЛАСУЕ ЗА ЗДАРОЎЕ

**Чарговы этап адкрытых дэбатаў «Выбірай.by», арганізатарам якіх выступае Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі, прайшоў у Нацыянальным алімпійскім камітэце. Месца правядзення не выпадковае, а, хутчэй, прадыктаванае тэмай — «Беларуская моладзь выбірае здаровы лад жыцця».**

У дыскусіі прынялі ўдзел дзве каманды — «Здароўе нацыі» і «Здаровы выбар», у склад якіх увайшлі пераможцы рэгіянальных этапаў праекта, што прадстаўляюць усе вобласці і Мінск. За ходам дэбатаў назірала каманда прафесійных экспертаў: Дзмітрый Дашчынскі, Наталля Цылінская, Віктар Сасуноўскі і іншыя.

Кампетэнтную ацэнку актуальным пытанням далі і спартыўныя чыноўнікі. Так, **міністр спорту і турызму Аляксандр ШАМКО** адзначыў, што колькасць спартыўных збудаванняў у параўнанні з дваццацігадовай даўнасцю сапраўды ўзрасла, аднак дэфіцыт некаторых аб'ектаў усё роўна застаецца.

— Сёння мы сутыкаемся з пэўнымі праблемамі па недахопе басейнаў. Гэта сведчыць не пра дрэнную інфраструктуру, а пра тое, што павышаецца попыт на актыўны лад жыцця не толькі сярод моладзі, — падкрэсліў міністр.

Удзельнікі дэбатаў адзначылі, што здаровы лад жыцця становіцца модным не толькі ў Беларусі, але і ва ўсім свеце, асабліва сярод маладога насельніцтва, што важна для будучыні любой краіны. Вялікую ролю моладзі падкрэсліў і **віцэ-прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Максім РЫЖАНКОЎ:** «Без моладзі прарыў у будучыню зрабіць немагчыма. Заўтра гэта будзе іх дзяржава, таму маладыя людзі павінны быць не проста ў курсе таго, што адбываецца ў краіне, яны павінны быць актыўнымі і палітычна падкаванымі».

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

# Яе называюць сталяром...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Любімым школьным прадметам Дзіяны была гісторыя, асабліва яе захапляла Сярэднявечча, рамантычная эпоха рыцараў, князёў і Рэнесансу. Адтуль жа з'явілася цікавасць да фолку. Таму можна лічыць, што рамесніцтва стала своеасаблівым кампрамісам паміж інтарэсамі дзяўчыны. Пасля школы яна вырашыла паступаць у Мінскі каледж мастацтваў.

— Спачатку я ўвогуле збіралася ісці вучыцца на мастацкую апрацоўку саломкі. Але ў той год на гэту спецыяльнасць не было набору, затое набіралі навучэнцаў на мастацкую апрацоўку дрэва. Я падумала, што працаваць з драўнінай нават больш цікава... Лічыла, што буду адна сярод хлопцаў у групе, а аказалася зусім наадварот — выключна жаноцкі калектыў. Не ведаю, чаму сёння менавіта дзяўчаты выбіраюць такія прафесіі. Магчыма, яны цягнуцца да прыгожага, а хлопцы цягнуцца ўжо да дзяўчат *(смяецца).*

З аповеду Дзіяны вынікае, што працаваць з драўнінай цяжка толькі першы час. Трэба трохі асвоіцца — і матэрыял рэжацца зусім лёгка (калі гэта не цвёрдая парода накшталт дуба). Сапраўды, дзіву даешся, калі бачыш, як тонкія дзявочыя рукі, здаецца, без вялікіх намаганняў здымаюць з дошкі стружку, а на вырабе пачынае праяўляцца малюнак. Але рамесніцтва — гэта не толькі творчасць. Сярод дысцыплін, якія вывучала Дзіяна, былі і выключна тэхнічныя, напрыклад, матэрыялазнаўства.



Паразмаўляўшы з дзяўчынай, складваецца ўражанне, што нічога асабліва складанага ў такой працы няма. Спачатку трэба зразумець задуму вырабу, што гэта будзе па канструкцыі: рамка для люстэрка, посуд, аб'ёмная скульптура ці, напрыклад, пано. Пасля гэтага выбіраюць матэрыял, з якім будуць працаваць. На дрэве алоўкам малююць эскіз — тое, што хочуць пабачыць у выніку. Далей — карпатлівая праца па методыцы Мікельанджэла: прыбіранне ўсяго лішняга. Апошняя стадыя — карэкцыя: шліфоўка і апрацоўка сродкамі, якія захоўваюць выраб у належным стане і надаюць выгляд дарагіх парод драўніны. Звычайна для гэтага выкарыстоўваюць лак і марылку.

Уражвае адказ Дзіяны на пытанне пра небяспеку такой працы: «За рукі і манікюр я не хвалююся. Калі ўсё рабіць акуратна і спакойна, то ніякай пагрозы няма. Не хачу сурочыць, але асабіста ў мяне, напрыклад, ніколі не было працоўных траўмаў».

Пасля заканчэння вучобы Дзіяна па размеркаванні трапіла ў раённы цэнтр рамёстваў у Чэрвені. Гэтая ўстанова адкрылася зусім нядаўна, і патрэбнага абсталявання там пакуль няма. Таму дзяўчына падпрацоўвае кіраўніком гуртка ў мясцовым Цэнтры культуры. Яна вучыць дзяцей мастацтву вітража і батыку. Разам з аднакурсніцай жыве ў прыватным доме, які ім выдзелілі на працы. Па Мінску асабліва не сумуе — ёй па душы спакойнае жыццё невялікага горада, дый да сталіцы, калі што, рукой падаць — каля гадзіны на маршрутцы. Штотыдзень Дзіяна прыязджае ў госці да бацькоў.

— Бывае, знаёмыя жартуюць, клічуць мяне «сталяром» ці яшчэ неяк, — кажа дзяўчына. — Але я спакойна да гэтага стаўлюся. Самае галоўнае тое, што ты адчуваеш падчас працы. Цяжка перадаць словамі, наколькі гэта прыемна — адчуваць пах свежага дрэва, дакранацца да яго рукамі, а пасля бачыць вынік.

Дзіяна кажа, што яе любімыя работы засталіся ў каледжы — такая там традыцыя. Адным з найлепшых яна лічыць твор на гістарычную тэматыку. Гэта вялікі шчыт, на якім выразана магутнае дрэва з партрэтамі вялікіх князёў літоўскіх. Міндоўг, Гедымін, Альгерд, Кейстут, Вітаўт, Ягайла — сапраўдны беларускі пантэон! Завяршаюць кампазіцыю тры маленькія шчыты ўверсе: з шасціканцовым крыжам, гербам «Калюмны» і старажытнай «Пагоняй».

— На адну работу ідзе прыкладна тыдзень працы, — расказвае Дзіяна. — Безумоўна, усё залежыць ад памераў загатоўкі і складанасці. Гатовыя работы каштуюць нямала, але я пакуль нічога не прадаю, збіраю ўласную калекцыю або дару сябрам. Прасцей кажучы, набіраюся досведу. Безумоўна, вырабы з дрэва — гэта прыгожа, на такі тавар ёсць попыт, у тым ліку і з боку замежнікаў. Адпаведна, і працу знайсці няцяжка. Пасля заканчэння каледжа мне прапаноўвалі ўладкавацца ў прыватную майстэрню, але я адмовілася, бо трэба было размяркоўвацца. Вельмі хочацца, каб больш беларусаў набывалі сабе такія рэчы, і тут справа не ў грашах. За гэтымі працамі стаіць не толькі асоба майстра, але і ўся гісторыя нашага народа, нашы традыцыі. У такіх рэчаў ёсць душа — беларуская.

Цяпер Дзіяна завочна вучыцца ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя



Фота Надзеі БУЖАН.

М. Танка на факультэце эстэтычнай адукацыі. Працаваць з дзецьмі ў яе атрымліваецца, але дзяўчына лічыць, што гэтаму таксама трэба вучыцца:

— Я ведаю, што педагагічная прафесія вельмі складаная. Калі прыехала ў Чэрвень працаваць, хацела праводзіць свае заняткі з дзецьмі толькі на беларускай мове. Але потым падумала, што на першых сустрэчах некаторыя могуць штосьці не зразумець, пасля чаго больш не прыйдуць займацца. Трэба вучыцца знаходзіць кантакт і ўзаемапаразуменне, тады рэалізоўваць усе задумы будзе прасцей.

Галоўная ж мара Дзіяны — займець сваю ўласную майстэрню. Па словах рамесніцы, гэта дазволіць ёй быць незалежнай у фінансавым і творчым плане.

— Безумоўна, я задумвалася: а ці правільны выбар зрабіла? Але зараз я адчуваю сябе шчаслівым чалавекам, бо раблю любімую справу. Ці ж гэта не галоўнае?

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

*З любоўю да зямлі*

# ЯК ЗАПУСЦІЦЬ «РУХАВІК» ВЯСКОВАГА ЖЫЦЦЯ?

## Развагі маладога інжынера сельскагаспадарчага ААТ



**Часам размеркаванне ўспрымаецца моладдзю як бессэнсоўна страчаны час. Але галоўны інжынер ААТ «Месціна», што ў Бярэзінскім раёне, 26-гадовы Яўген КАРАЛЁЎ не толькі не збіраецца з'язджаць з «глыбінкі» пасля адпрацоўкі, але і ўвогуле не прамяняў бы сваё жыццё на гарадское.**

Мы сустракаемся з хлопцам у невялікай альтанцы на мехдвары — наўкол прыпаркавана некалькі трактароў, камбайнаў, грузавікоў. Частка з іх чакае рамонту, менавіта гэта непасрэдны абавязак галоўнага інжынера. За час размовы да яго некалькі разоў падыходзяць механізатары — кансультуюцца, як лепш «прааперыраваць» сваю тэхніку.

Будучы інжынер нарадзіўся не вельмі далёка ад свайго цяперашняга месца працы — у вёсцы Навасёлкі пад Беразіно. Пасля школы хлопец атрымаў сярэднюю спецыяльную адукацыю ў каледжы, потым паступіў у Беларускі дзяржаўны аграрнатэхнічны ўніверсітэт. Яму пашчасціла — выбар месцаў для размеркавання быў даволі вялікі, сярод іх і Месціна.

— Жыццё ў горадзе ніколі не вабіла, — кажа Яўген. — Сам я вясковы хлопец, мяне цягне да прыроды. Гэта, дарэчы, абумовіла і цікавасць да будучай прафесіі — бацька працаваў механізатарам. Таму я з дзяцінства бачыў, што такое буйная тэхніка. Яшчэ да таго, як атрымаў пасведчанне кіроўцы, корпаўся ў «масквічы», «запарожцы», разбіраўся, што да чаго. Ды і ў школе неяк больш атрымлівалася з такімі навукамі, як матэматыка, фізіка, чым з мовамі.

Цяпер Яўген жанаты, і нават ужо бацька — менш як год таму ў яго нарадзілася дачка. На «падыходзе» — другое дзіця. Разам з жонкай яны здымаюць кватэру ў Беразіно. Абыходзіцца гэта зусім не дорага, асабліва калі параўноўваць са сталічнымі цэнамі, — 750 тысяч. Летам, калі ў кватэры стаіць спёка, уся сям'я часова пераязджае да бацькоў Яўгена. На працу інжынер ездзіць на аўтобусе, калі атрымліваецца — карыстаецца аўтамабілем. 40 кіламетраў — няблізкі свет, хоць і адзін раён.

— Заробак у мяне залежыць ад сезона, — распавядае малады спецыяліст. — Ды і сёлета ёсць праблемы са збытам, у Расіі набываюць менш нашай прадукцыі, таму ў параўнанні з мінулым годам зарплаты знізіліся. Летам атрымліваю каля 6-і мільёнаў, узімку — ад 4-х. Летась маглі і восем зарабіць. Дарэчы, я заўважаю нават па сваіх знаёмых, аднакурсніках — заробак у сельскай гаспадарцы практычна ўсіх задавальняе. Але ў працы ёсць мінусы, якія нярэдка прымушаюць людзей звальняцца адразу пасля адпрацоўкі ці нават выплачваць грошы за свабоднае размеркаванне. Гэта, у першую чаргу, адсутнасць выхадных — на адпачынак часу амаль не застаецца. А вы ж самі разумееце, наколькі гэта важна для маладых людзей. Нават узімку ў нас адзін выхадны — нядзеля.

Можа, менавіта таму моладзі ў гаспадарцы няшмат? Па словах Яўгена, каля 20 працэнтаў.

Абавязкі галоўнага інжынера — даглядаць усю тэхніку. Прычым рукамі працаваць даводзіцца няшмат, у асноўным трэба разбірацца ў складанасцях і падказваць механізатарам, якога рамонту яна патрабуе. Затое хапае папяровай працы. Малады спецыяліст займаецца заказам запчастак, афармленнем усіх адпаведных дакументаў.

— Галоўнае, што я лічу цяжкасцю ў такой рабоце — стаўленне некаторых механізатараў. Паверце мне на слова, калі чалавек сам не беражэ тэхніку, не даглядае яе, нават самы якасны рамонт не дапаможа. Праз некалькі тыдняў усё зноў ламаецца, прыйдзецца перарабляць. На жаль, у нас многія людзі ставяцца да працоўнай тэхнікі, як да чужой; іх не турбуе, што пасля на ёй яшчэ некаму працаваць. Але ёсць і такія, хто працуе на трыццацігадовых «машынах», і яны ў іх у шыкоўным стане, усё, як той казаў, «шэпча».

Дарэчы, колькасць «падапечных» у інжынера пастаянна расце. Ледзь не кожны сезон у гаспадарцы з'яўляецца новая тэхніка. Сёлета вось набылі «МАЗ».

— Амаль уся тэхніка ў нас беларуская, — расказвае Яўген. — Толькі нешта з навяснога (касілкі, граблі) часам бывае польскай ці нямецкай вытворчасці. Нярэдка, калі разам з іншымі інжынерамі цэнтралізавана нешта набываем у Мінску, хлопцы з іншых гаспадарак быццам бы з гонарам кажуць, што ў іх амаль нічога беларускага няма. Але я з імі не згодны — калі нашу тэхніку глядзець, яна працуе выдатна.

Акрамя гэтага, Яўген выконвае абавязкі галоўнага энергетыка, займаецца электрыфікацыяй гаспадаркі. Ён шчыра прызнаецца, што ў гэтай сферы валодае толькі базавымі ведамі, таму гэта самы цяжкі для яго аспект працы.

— Я не магу сказаць, што такая праца не надакучвае. Вядома, стамляешся ад бясконцых дэталяў, папер... Няма ўжо той цікавасці, што калісьці была, бо займаешся адным і тым жа штодзень. Але і не варта чакаць ад работы іншага — на тое яна і работа. Галоўнае для мяне — добрасумленнасць. Важна заўсёды ведаць, што ты зрабіў усё, што ад цябе залежала.

**«Я заўважаю нават па сваіх знаёмых, аднакурсніках — заробак у сельскай гаспадарцы практычна ўсіх задавальняе. Але ў працы ёсць мінусы, якія нярэдка прымушаюць людзей звальняцца адразу пасля адпрацоўкі».**

Яўген — аматар актыўнага адпачынку. Калі вольная хвілінка ўсё ж выпадае, ён накіроўваецца на Бярэзіну — лавіць рыбу. Вядома, як і для большасці рыбакоў, улоў для яго не галоўнае. Як сапраўдны бацька, інжынер шмат гуляе — па горадзе з каляскай. Узімку, калі вольнага часу больш, разам з калегамі Яўген арандуе залу для міні-футбола.

Маладога спецыяліста не пужае перспектыва ўсё жыццё адпрацаваць на пасадзе галоўнага інжынера, а ў вялікім горадзе бываць толькі наездамі. На развітанне пытаемся, якога лёсу ён хацеў бы для сваіх дзяцей.

— Тое, што я вырас у глыбінцы, ніякім чынам не зрабіла мяне горшым за равеснікаў з горада. Паміж вёскай і горадам цяпер няма вялікай розніцы. Тут таксама можна добра жыць — мае бацькі штогод ездзяць на адпачынак за мяжу, былі ў Грэцыі, Турцыі, іншых краінах. Акрамя таго, на маю думку, у горадзе моладзь часта псуецца, звязваецца з алкаголем, наркотыкамі. Тут жа ўсе заўжды пры справе, цяжэй схавацца ад дарослых вачэй. Хапае цікавых заняткаў, наўкол прырода, прыгажосць. Таму, безумоўна, я падтрымаў бы жаданне дзяцей застацца на Бярэзіншчыне. Спадзяюся, што так яно і атрымаецца.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*
*Мінск — Бярэзінскі раён — Мінск.*



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

*Таямніцы нетраў*

# КАЛІ ВЕДАЦЬ МОВУ КАМЯНЁЎ...

## Геолагі шукаюць не толькі тое, што блішчыць

**Так атрымалася, што нашы веды пра каштоўныя камяні абмяжоўваюцца ў асноўным фотаздымкамі ў кнігах і кадрамі з кінафільмаў. Ну не жадаюць капрызныя прыродныя цуды знаходзіцца пад нагамі, як звыклая галька ці пясок! І калі сярод знаёмых няма аматара-калекцыянера мінералаў, цягу да прыгожага дапаможа наталіць музей землязнаўства пры геаграфічным факультэце БДУ. Яго загадчыца Валянціна СМАЛЯКОВА расказала, што можна назваць жамчужынай экспазіцыі, якое багацце хаваецца ў беларускай зямлі і што шукаюць студэнты-геолагі на летняй практыцы.**

— Палюбавацца камянямі прыходзяць маладыя людзі з розных факультэтаў. Пасля занняткаў можна бачыць і студэнтаў-географаў, і геолагаў. Апошнія тут займаюцца і справай. Паколькі выстава «Каменная казка», арганізатарам якой выступае музей, мае навукова-асветніцкі характар, пастаянна працуе вучэбная гемалагічная экспрэс-лабараторыя. Студэнты дапамагаюць вызначаць, які канкрэтна камень прынёс чалавек. Для наведвальнікаў такая магчымасць асабліва цікавая: часам пацеркі і завушніцы аказваюцца зробленымі зусім не з тых мінералаў, пра якія казаў прадавец, а непрыкметны кавалачак адшуканага камення можа аказацца ўнікальным археалагічным адкрыццём.
Вы не паверыце, але яны... пачалі хадзіць у тыя самыя гаражы! Уяўляеце? А гэта ж ужо замах на саму філасофію мужчынскага быцця! Раней жанчыны ішлі плакаць у ванны пакой, бо там акустыка лепшая. А цяпер што: яна пакрыўдзілася — і ў гараж? Ці проста так, між іншым, кажа, маўляў, ты тут уходжвайся, дарагі, а я Каці і Верцы абяцала ў гаражы дапамагчы?.. Ну не тое, каб яны хадзілі ў зусім такія ж гаражы, як мужчыны: з аўтамабілем, рознымі ключамі, зімнім/летнім камплектам шын, старой канапай, мяхамі бульбы і хатнімі нарыхтоўкамі. У свеце з'явіўся новы трэнд, які набірае ўсё большую папулярнасць, — «гаражы» для жанчын (Калі перакаазаць на свой капыл словы аднаго з герояў фільма «Формула кахання»: нават назву ўзялі, не пагрэбавалі). Гаворка пра будаўніцтва спецыяльных дамкоў (нічога агульнага з дачнымі «шпакоўнямі») для адасобленасці, дзе дзяўчаты могуць прымаць сяброўак і весці свае жаночыя размовы. Нехта выкарыстоўвае такія «гаражы» для таго, каб працаваць у іх, стварыўшы, напрыклад, майстэрню рамесніка. І потым шыць там, вышываць. Ну, карацей, і спраўй займацца, і нам, мужчынам, даць час адпачыць. («Я прагаладаўся і адкаркаваў піва. Гатаваць не так ужо і складана, не ведаю, чаго там жанчыны скардзяцца?») Для іншых гэта можа быць студыя для заняткаў ёгай. Хтосьці ставіць у «жаночым гаражы» гідрамасажную ванну для рэлаксу. Пры жаданні можна арганізаваць у доміку будуар (ага, і перанесці туды ўвесь гардэроб. Каб было, як у анекдоце: «Прыбіралася ў шафе. З яе ўсё вывaліла, перамерала, нафарбавалася, натанцавалася... Усё — стамілася!»). Але я спадзяюся, што на нашай урадлівай для бульбы глебе гэтая традыцыя не прыжывецца. А то як: усе капаць, а яны — у свой домік? Алё, гараж!!!

І вось нядаўна даведаўся, як хлопцы вырашылі «паквітацца» з дзяўчатамі — іх жа зброяй. Без чаго не можа жыць ніводная сучасная прыгажуня? Правільна, без рэгулярнага выкладвання фотаздымкаў у «інстаграме»! («Апішыце ступень вашай адэкватнасці». — «Я не раблю сэлфі». — «Вы прыняты!») Ну, ведаеце, такіх: «вусны «качачкай», «а вось мая крутая «пятая кропка», «гэта мяне знялі каханы, пакуль я спала» і іншых. (Шкада, тут не пажартуеш кштальту «Адна дзяўчына так шмат чытала, што развучылася фатаграфаваць сябе ў люстэрку».) Дык вось хлопцы з адной суполкі паказалі ў сацыяльных сетках пародыю на дзяўчат «Якімі нас бачаць мужчыны». Ідэя спадабалася, і яе падхапілі мужчыны па ўсім свеце. Сутнасць жарту простая: хлопцы, пераймаючы манеры і, галоўнае, позы дзяўчат, пачалі фатаграфавацца, як гэта вельмі любяць рабіць апошнія. Напрыклад, лежачы ў пеннай ванне ў акружэнні мноства запаленых свечак... Ці там жа, але ў пялёстках ружаў... На фоне мноства раскіданых вакол пар абутку... Або прыціскаючы да сябе коціка ці сабачку... Што тут смешнага? Тое, што гэта робяць барадатыя хіпстары — даволі мускулістыя хлопцы. (Як гаварыў Астап Бэндэр: «Хто скажа, што гэта дзяўчынка, няхай першы кіне ў мяне камень».)

...Вядома ж, хлопцы жартуюць. Хоць і не без намеру. Дзяўчаты, будзьце сапраўднымі, а не «інстаграмнымі»! А кашуля... Як я там казаў? Нам і апошнюю для вас зняць не шкада!

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Люблю атмасферу вёскі»

**«Прыязджаючы ў дом, дзе жывуць мае бацькі, дзе магу пагаспадарыць на сваім падворку, адчуваю сапраўднае шчасце!»**



(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

***— Аднойчы ты сказаў: «Я не спявак, не музыкант. Я артыст». Чым, на твой погляд, у наш час вызначаецца сапраўдны прафесіянал на сцэне?***

— Артыст — гэта той чалавек, які дае публіцы адчуванне, што яе чакае нешта неверагоднае на сустрэчы з ім. І тут трэба ўлічваць і як ён спявае, як рухаецца, як размаўляе са слухачамі. Я разумею, што не валодаю ніводнай з вышэйназваных «пазіцый» ідэальна, але часткова маю ўсё.

***— На рахунку вашага гурта чатыры альбомы, шэраг кліпаў. Ці плануеце нейкі падарунак для прыхільнікаў у сувязі з юбілеем?***

— Для ўсіх тых, хто цікавіцца і любіць нашу творчасць, робім невялікае свята. Мы гурт са стажам, але нашы прыхільнікі — людзі вельмі розныя, таму вырашылі проста сабраць усіх сваіх сяброў 22 кастрычніка на канцэрт у рэстаране «Сябры». Я пакуль яшчэ не вырашыў канчаткова, але, магчыма, зробім нават бясплатны ўваход. Усіх чакае вялікі танцпол і сюрпрызы ад нас, прэм'еры песень (з адной з якіх плануем пазмагацца на сёлетнім адборы на «Еўрабачанне»).

***— Вы нядаўна знялі новы відэакліп «Павязу цябе ў вёску», у якім чарговы раз закранулі жыццё ў глыбінцы...***

— Ведаеш, гэтая тэма ўвесь час жыве ўва мне. Я вельмі люблю атмасферу вясковага жыцця. Многім было проста незразумела, як так — «Бульба ўзыходзіць, спеюць буракі... Ва ўласнасць афармлена зямля»? Мне шмат пішуць каментарыяў са словамі ўдзячнасці за песню. Я сам не так часта, як хацелася б, прыязджаю ў родную Сівіцу, але стараюся вырвацца туды хоць раз на тыдзень. І большага задавальнення, чым ад адпачынку там, нідзе не атрымліваю. Бо, прыязджаючы ў дом, дзе жывуць мае бацькі, дзе магу пагаспадарыць на сваім падворку, адчуваю сапраўднае шчасце!

Песня склалася даўно, але мы з хлопцамі паслухалі яе і адклалі на нейкі час. І вось летам я вырашыў зладзіць для нашай кампаніі «карпаратыў» у вёсцы: свежае паветра, лазня... І тады мне прыйшла думка, што трэба здымаць кліп. Паклікалі аператараў знаёмых — і пачалі тварыць. Атрымалася цудоўная імправізацыя, дзе, на мой погляд, паказана шчырая, сапраўдная гісторыя. І што мне найбольш падабаецца: у песні ёсць патрыятызм і ён натуральны.

***— У вышэйназванай кампазіцыі ёсць прыгожая фраза «Я пакажу табе іншае жыццё...» Якое яно, па тваіх назіраннях?***

— У вёсцы жыць складаней, чым у горадзе. Гэта не тое, як у гарадскіх, калі ты толькі ходзіш на працу і вяртаешся ў сваю кватэру, па дарозе зазірнуўшы ў краму. У той жа Сівіцы суседзі гадуюць авечак, трымаюць гаспадарку. І я шчыра захапляюся такімі людзьмі і паважаю іх. Большасць гараджан родам з вёсак. Мы едзем у горад вучыцца, застаёмся там працаваць... Але я цвёрда перакананы, што абавязкова вярнуся да зямлі.

***— Мне здаецца, вёска па-іншаму фарміруе і характар чалавека...***

— Калі толькі прыехаў у Мінск, то дакладна разумеў, што выкладвацца трэба напоўніцу, бо ў мяне проста так нічога не з'явіцца. Я з першага дня паступлення ў Акадэмію музыкі думаў пра тое, дзе буду жыць праз пяць гадоў. І гэта стала добрым стымулам, каб працаваць і зарабляць на будучую кватэру. Такія перакананні і з'яўляюцца перавагай вясковых хлопцаў і дзяўчат — у іх ёсць стрыжань, працавітасць.

***— Скажы, а колькі «Драздам» трэба адпрацаваць канцэртаў, карпаратываў, каб дазволіць сабе адпачыць дзень-другі?***

— Мы не можам спыняцца, хаця, па вялікім рахунку, лічбы ганарараў для нас — не самае важнае. Проста, пакуль ты малады, маеш энергію, паўзы — самая страшная з'ява. Яны разбураюць нас і спыняюць у развіцці. У той жа час бываюць часам непаразуменні з нашымі сем'ямі, бо мы ж амаль увесь час у раз'ездах. «Дразды» для кожнага з нас — жыццё, і гэтая праца — на першым месцы (хоць у працоўных кніжках пазначаны іншыя сферы дзейнасці). Магчыма, калісьці мы стомімся, станем больш вопытнымі, і тады ўжо зусім па-іншаму будзем разважаць пра такія рэчы...

**Алена ДРАПКО.**
*drapko@zviazda.by*



**«Я з першага дня паступлення ў Акадэмію музыкі думаў пра тое, дзе буду жыць праз пяць гадоў. Такія перакананні і з'яўляюцца перавагай вясковых хлопцаў і дзяўчат — у іх ёсць стрыжань, працавітасць».**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.654.
Нумар падпісаны ў 19.30 7.10.2015 г.

■ Хто каго?

# «ДРУЖА ЛЮБЫ, ДРУЖА МІЛЫ, ТЫ КАПАЙ КРЫХУ ГЛЫБЕЙ...»

**Даўно заўважана, што ў добрай справе не абысціся без таго, каб дрэнным словам хтосьці не абазваў. Ну ў прыватнасці: «Здымак, які вы прапанавалі на чарговы конкурс, вельмі і вельмі няўдалы, — абураецца спадар В. з Мінска. — Ну скажыце, што на ім — жалезны коўш экскаватара, паўтоны металу? Хіба можна пра іх нешта «сачыніць»?»**



Пагодзімся: гэта і сапраўды задача не з лёгкіх. Але ж нашым чытачам да такіх не прывыкаць: як-ніяк пятнаццаты год «трэніруюцца»! Больш за тое — на ўсе галасы сцвярджаюць, што конкурс на найлепшы подпіс да здымка — адзін са знакаў адроснення, свайго роду «фішка» газеты, якая ў выніку «не дае сваім чытачам сумаваць, прымушае варушыць мазгамі». «Да таго ж прачытаеш потым, што атрымалася (ва ўсіх разам!), і дрэннага настрою як не бывала, бо радкі ёсць на дзіва трапныя! Можна сказаць, афарызмы», — піша, напрыклад, **спадарыня Валянціна Гудачкова з Жыткавіч...**

«Што да апошняга здымка, то цяпер усюды нешта капаюць. Не дзіва, што ў гарадах ды на вялікіх будоўлях, у глыбінцы таксама, — разважае далей Валянціна Апанасаўна. — Мода пайшла на сажалкі на ўласных падворках (паблізу ёсць нават з фантанам!), а то і на азярцо пад вокнамі... Гэта і сапраўды прыгожа. А ўжо зручна як... Ну ўзяць хоць бы суседа. Ён два разы экскаватар падганяў — ладны вадаём сабе выкапаў. Затое цяпер парог пераступіў — і ўжо на рыбалцы. Сядзіць сабе ды глядзіць — на паплавок, на свойскага ката, што на беразе ходзіць, пачастунку чакае... Мілата!»

Менавіта яна, трэба разумець, і дыктуе высنову:

*Добра мець уласны дом,*
*Каля дома — вадаём...*
*Экскаватар з тыдзень роў —*
*Здаравенны выйшаў роў!*
*І... задачка мужыкам,*
*Бо капалі, ды... не там!*

Гэта бывае, на вялікі жаль. І, як сведчыць рэдакцыйная пошта, не толькі ў Жыткавічах. У Гомелі (калі верыць **спадарыні Раісе Васільевай**) таксама:

*У перапынку для абеду*
*Мужыкі вядуць «бяседу».*
*Кшталту: мы папрацавалі,*
*Дзе сказалі — там капалі.*
*...Але ж Богу невядома,*
*Як тут людзям выйсці з дому!»*

Праўда, каго гэта хвалюе, апроч самых людзей? Хіба што гора-праекціроўшчыкаў ды гора-«капальнікаў» (у тым выпадку, калі пацярпелыя ўсё ж такі скардзяцца)... Ну, можа, яшчэ **спадара Валерыя Гаўрыша з Чавусаў**, які пачаў свае радкі, можна сказаць, з рэкламы, а закончыў...

*Дзякуй фірме «Амкадор»:*
*Класны экскаватар!*
*Ускапаў ён летась двор, —*
*Не прайсці дахаты...*
*Праўда, Федзю з Андрыянам*
*Беды іх «па барабану».*

Чаму? Ды відавочна ж: яны, гэтыя беды, — чужыя. Зусім іншая рэч, калі свае:

*Сажалку сем дзён капалі,*
*Хоць і не ў той бок.*
*Абурацца потым сталі*
*Ваня ды Васёк:*
*— Хто за працу нам заплаціць?*
*Як мы будзем жыць?..*
*Хлопцы,*
*Каб вось так не плакаць,*
*Меней трэба піць!*

Мае, мае рацыю **спадар Мікола Кісель** з Мінска: меней трэба... А то краіна ў лідарах трымаецца па ўжыванні алкаголю. І, як падаецца, пазіцыі свае здаваць не збіраецца.

Сведчаннем таму дыялог, які, гледзячы на мужчын са здымка, «пачуў» **спадар Валерый Гаўрыш**:

*— Недалёка мая дача.*
*Трэба выкапаць ставок...*
*— Не магу — прараб убачыць...*
*— І яму налью... Аддзячу-у...*
*— Дзе капаць? Вядзі, браток!*

Анекдот у тэму. «Я сабе дачу купіў. Домік, сотка зямлі...» — хваліцца адзін мужык. «Дык што ж ты там пасадзіш?» — здзіўляецца другі. «Вось таму і купіў»... Трэба разумець, каб не садзіць? І не капаць — «там» альбо «не там» — роў, сажалку, азярцо, ставок. Ці ўсё ж нешта іншае?

Зноў маналог з ліку «пачутых». Як мяркуе спадар **Анатоль Гарачоў з Іўеўшчыны**, адзін з мужчын падышоў да экскаватаршчыка (хто ёсць хто — вырашайце самі) і, што называецца, просам просіць (гэта значыць, шчыра, настойліва, умольна):

*Дружа любы, дружа мілы,*
*Ты ж капай крыху глыбей!*
*Тут не проста быць магіле,*
*Тут — для цешчы «маўзалей»...*
*Языкамі людзі плешчуць,*
*Што хаваю, як бандыт...*
*Дык пакінула ж мне цешча*
*Іпатэку і крэдыт...*

Зяць жа, як усім вядома, гатовы ўзяць (у цешчы — само сабою...). А вось аддаваць (тым больш замест яе) — гэта ўжо прабачце! (Яшчэ адзін анекдот у тэму. «Сынок, калі я памру, — кажа адна цешча зяцю, — ты, калі ласка, не хавай мяне, а крэміруй і попел рассып вось тут, у двары». «Не, мама, — адмаўляецца той, — я вас ведаю: ветрык дзьмухне — і вы ўжо ў хаце).

Трэба разумець, каб не «дзьмухнуў», і ўзяўся гэты зяць будаваць «маўзалей» (ці ўсё ж саркафаг?), а потым з усіх сіл дапамагаць... экскаватару.

Думаеце, як хваробе кашаль? І памыляецеся, бо (на думку **спадарыні Алены Бажок з Бабруйска**) цяпер бывае, што:

*Экскаватар падагналі,*
*А салярکі — фігу далі...*
*Таму коўш, згадаўшы «маць»,*
*Трэба пузам націскаць.*

Добра, што хоць адзін з мужыкоў яго мае!..

І як жа дрэнна, што ў моду, ледзьве не з садка, уваходзіць брыдкаслоўе. (Фізрук на адным з урокаў спытаў: «Дзеці, што выбіраем: крос альбо футбол?» Тыя, вядома ж, за апошняе... «Ну тады, — аб'яўляе настаўнік, — да першага мацюка. Як толькі пачую, адразу ж бяжым крос»... У выніку дзеці нават мяч не развялі — прыйшлося бегчы.)

Дык, можа, і мужыкам гэтым трэба? **Спадар Мікалай Старых з Гомеля** ведае, куды: «Глянуўшы на апошні конкурсны здымак, я адразу ўспомніў сваю армейскую службу. Тады непадалёк ад нашай часці ваенныя будаўнікі стаялі. Гэта пра іх казалі, што тры салдаты і лапата замяняюць экскаватар», — узгадвае Мікалай Валянцінавіч і раіць:

*Паламаўся экскаватар?*
*Дык бяжыце да камбата*
*(Што камандуе «будбатам»),*
*Папрасіце тры рыдлёўкі*
*Ды байцоў удалых столькі...*

Два як быццам ёсць, хоць, падобна, і не з «будбата»... А ў астатнім усё правільна: нашы «байцы» могуць горы звярнуць! Калі на скарб які не напоруцца:

*Гэтакай «лапатай».*
*Хлопцы роў капалі*
*Ды паблізу хаты*
*Скарбы адшукалі...*
*Маракуюць, як ім быць:*
*З кім дзяліць?*
*З кім не дзяліць?..*

Праблема, якую згледзеў на здымку **спадар Мікола Кісель.**

Яшчэ адну (і, на жаль, зусім не жартоўную) убачыла на здымку **спадарыня Бурко з Бярэзіншчыны.** «У нас, у вёсцы Капланцы, на кожнай вуліцы ёсць нічыйныя хаты, — піша Ніна Мацвееўна. — Яны, вядома ж, не ўпрыгожваюць вёску, і з імі трэба нешта рабіць... У нас такая практыка: спачатку да сялібы пад'язджае экскаватар і капае глыбокую яму. Потым з'яўляецца бульдозер і ссоўвае туды гаспадарчыя пабудовы, пладовыя дрэвы, студню, кусты... Зверху ўсё засыпаецца зямлёй і справа, як быццам, зроблена. Але ж чыста і гладка толькі на паперах, бо на былое паселішча вельмі хутка вяртаецца быльнёг ды кустоўе... А самае крыўднае: на тым месцы ўжо ніхто не пабудуецца...»

Адкуль

*Экскаватар ў Капланцах —*
*Вельмі страшны агрэгат,*
*Ён магільшчыкам працуе*
*У пахаванні сірат-хат.*
*Закапае, і ніколі*
*Тут не стане новы дом...*
*Пляц у вёсцы паняволі*
*Зарастае хмызняком.*

«Не смешны ў мяне атрымаўся подпіс, — прызнаецца спадарыня Бурко, — але ж у каго што баліць...».

У многіх, пагодзімся з аўтаркай, — душа: за нашу зямельку, за вёску... У мужчын са здымка, як мяркуе **спадарыня Гудачкова**, — за сябе любімых:

*Даўнюю праблему*
*«Кадры» вырашаюць:*
*Талент дзесь зарылі, —*
*Трэці год шукаюць!*

Значыць, малайцы яны, упартыя. А калі так, то некалі знойдуць... І не толькі талент. Паводле спадара Гарачова:

*Вабіць золата*
*З вельмі далёкіх вякоў,*
*Яно мроіцца людзям да скону!*
*Хоць і канулі ў Лету*
*Як рэчка Юкон,*
*Так і дзіды цара Саламона.*

І сапраўды: многае з часам мяняецца, многае — не (як заўважаюць сужэнцы Астроўскія з Мінска). Узяць хоць бы тыя ж адносіны да працы:

*Пастаялі, пакурылі.*
*Нейкі час прагаварылі.*
*Папалуднуюць яшчэ...*
*«Праца ў лес не ўцячэ», —*
*Так гавораць часам людзі.*
*«Што зарплата?..»*
*Неяк будзе!*

А хочацца ж, каб па-людску!.. Бо грошы сёння столькі дзвярэй адчыняюць (у аднаго жаніха іх не хапіла на выкуп нявесты: ён да палучкі вяселле аднёс)... Горка, згадзіцеся? Горка. Значыць, нельга на працы «вісець на каўшы», — трэба працаваць.

Шчыры дзякуй усім, хто гэта робіць, робіць сумленна. Прычым не толькі на працоўных месцах, не толькі на сваіх падворках, але і над чыстым лістом паперы, складаючы радкі да чарговага конкурснага здымка.

Самы час нагадаць пра папярэдні («Звязда» 19 жніўня г.г.) — з дзядком, які, стоячы на плыце, ці то вудзіў рыбу, ці то гандляваў піражкамі, ці то глядзеў на дзяўчатак з вёсламі... Дык вось: на думку вялікага чытацкага журы, найлепшыя радкі пра яго склалі **спадарыні Соф'я Кусянкова з Рагачоўшчыны, Ніна Бурко з Бярэзіншчыны, Раіса Васільева з Гомеля, Валянціна Гудачкова з Жыткавіч, спадары Валерый Гаўрыш з Чавусаў, Анатоль Гарачоў з Іўеўшчыны, мінчанін Віктар Трайкоўскі і...**

Яшчэ адно прозвішча называецца не проста так, не звычайным радком, — рыфмаваным:

*Вось **Міколу Кісяля***
*Я хваліў бы і хваліў,*
*Хоць не даў ён ні рубля*
*Ды і чаркі не наліў.*
*Крыўду тую я сцярплю,*
*Пагляджу наўкола*
*Ды і зноўку пахвалю:*
*Маладзец, Мікола!*

Так выказаў свае эмоцыі **Анатоль Гарачоў** — папярэдні пераможца конкурсу да... цяперашняга, бо такія ж словы хацела адрасаваць **спадару Кісялю** і журы маленькае, рэдакцыйнае, менавіта яму прысудзіўшы прыз у выглядзе бясплатнай падпіскі на «Звязду» на першы квартал наступнага года.

Вы хацелі б, каб у 2016-м найстарэйшая беларускамоўная газета прыходзіла і да вас? Тады выпісвайце альбо ўважліва глядзіце на чарговы конкурсны здымак, прыдумвайце подпіс — кароткі (не больш за 8 радкоў), трапны, па магчымасці, смешны — і дасылайце ў рэдакцыю. Загадзя ўдзячныя.

**Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*



Фота Анатоля Клешчука

Даты | Падзеі | Людзі

**8 КАСТРЫЧНІКА**

**1870** год — 145 гадоў таму нарадзіўся Аляксандр Ксавер'евіч Булатовіч, падарожнік, дыпламат, публіцыст. Паходзіў з патомных дваран Гродзенскай губерні. Сапраўдны член Рускага геаграфічнага таварыства. У 1896-1900 гадах тройчы пабываў у Эфіопіі. Па просьбе імператара Менеліка II даследаваў стан заходняй мяжы краіны, прапанаваў праграму мерапрыемстваў па рэарганізацыі арміі і дзяржапарату Эфіопіі. Сабраў значны матэрыял па этнаграфіі, праблемах рабства і сацыяльнай структуры эфіопскага грамадства. За падарожжа да возера Рудольф з ваеннай экспедыцыяй адзначаны найвышэйшай эфіопскай узнагародай — залатым шчытом з шабляй, расійскім ордэнам Станіслава 2-й ступені, малым сярэбраным медалём імя П. Сямёнава Рускага геаграфічнага таварыства.

**1906** год — Леў Талстой, даведаўшыся пра тое, што Расійская акадэмія навук вылучыла яго кандыдатам на Нобелеўскую прэмію па літаратуры за 1906 год, накіраваў ліст фінскаму пісьменніку і перакладчыку Арвіду Ярнефельту. У ім Талстой прасіў свайго знаёмага праз шведскіх калег «пастарацца зрабіць так, каб мне не прысуджалі гэтай прэміі», бо, «калі б гэта здарылася, мне было б вельмі непрыемна адмаўляцца». Ярнефельт выканаў гэта далікатнае даручэнне, і прэмія была прысуджана італьянскаму паэту Джозуэ Кардучы, імя якога сёння вядома хіба што італьянскім літаратуразнаўцам. Талстой быў задаволены тым, што прэмія яму не прысуджана. «Гэта пазбавіла мяне, — пісаў ён, — ад вялікага цяжару — распарадзіцца гэтымі грашыма, якія, як і ўсякія грошы, па маім перакананні, могуць прыносіць толькі зло». Верагодна, з пункту гледжання сённяшняга прагматызму, рэалій часу ды і проста псіхалогіі большасці людзей, думкі і дзеянні Талстога — суцэльны парадокс. «Грошы — зло», аднак на іх можна было зрабіць масу добрых спраў, урэшце, іх можна было раздаць бедным. Ды ці мала можа быць тлумачэнняў з названых суб'ектыўных пазіцый. Але логіка генія гэтаму відавочна не адпавядала. Магчыма, менавіта таму, што ён быў геній?



**1917** год — у Расіі быў створаны Трэці кааліцыйны Часовы ўрад у складзе шасці міністраў-капіталістаў і дзесяці міністраў-сацыялістаў на чале з А.Ф. Керанскім.

Было сказана

**Алесь БАЧЫЛА, паэт:**

*«Кволасць душы, як вада нежывая,*
*А ў нежывой жа нішто не жыве».*

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

# ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | - капитальное строение, инв. № 413/С-18998 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад), площадью 44,0 кв.м, расположенное по адресу: г. Свислочь, ул. Свердлова, 3Б/1;<br>- капитальное строение, инв. № 413/С-18997 (назначение – здание неустановленного назначения (бойня), наименование – бойня), площадью 318,2 кв.м, расположенное по адресу: г. Свислочь, ул. Свердлова, 3Б. Составные части и принадлежности: холодная пристройка, 2 склада. |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 425250100001001868, площадью 0,2444 га (назначение – земельный участок для размещения объектов иного назначения), расположенный по адресу: г. Свислочь, ул. Свердлова, 3Б. Земельный участок имеет ограничения (обременение) прав в использовании: земли, расположенные в охранных зонах линий электропередачи (код 13.2), площадью 0,0139 га. |
| **Начальная цена продажи** | 355 600 000 (триста пятьдесят пять миллионов шестьсот тысяч) белорусских рублей с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 35 560 000 (тридцать пять миллионов пятьсот шестьдесят тысяч) белорусских рублей |
| **Продавец** | Свислочский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231969, г. Свислочь, ул. Комсомольская, 6, тел. 3-50-22 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34 |
| **Условия аукциона** | Без условий |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225. |

**Аукцион состоится 29 октября 2015 г. в 14.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209.**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 03.03.2015 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 23 октября 2015 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

В связи с утерей круглой мастичной печати частного строительного унитарного предприятия «БелТурк Стройфинанс» (УНП 191046049), печать УП «БелТурк Стройфинанс» **считать недействительной.** УНП 190629407

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703** | | |
| **Продавец** | **ООО «БЕЛТУРПРО», г. Гомель, ул. Федюнинского, д. 17, к. 2-4** | | |
| **Предмет аукциона** | | | |
| **Наименование** | **Общая площадь** | **Инвентарный номер** | **Адрес** |
| Производственное помещение | 7541,1 кв.м | 350/D-233010 | Гомельская обл., г. Гомель, ул. Лепешинского, 7Г-2 |
| Составные части и принадлежности | Склад металлический (175 кв.м), автомобильная дорога к помещению (876 кв.м) | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 950 000 долларов США** | | | |
| **Сведения о земельном участке** | Площадь **1,3265** га. Земельный участок предоставлен в общую долевую аренду для обслуживания зданий и сооружений по 31.12.2047 (доля в праве аренды продавца 833/1000) | | |
| **Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с №3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в евро (EUR) – 3012343265060; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** рабочих дней после проведения аукциона | | |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | | | |
| Оплата за предмет аукциона **с учетом НДС 20%** производится резидентами РБ в белорусских рублях по курсу Нацбанка РБ на дату платежа; нерезидентами РБ в белорусских рублях либо в иностранной валюте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи | | | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи | | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by** | | | |
| **Дата и время проведения аукциона** | **11.11.2015 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | |
| **Дата и время окончания приема документов** | **09.11.2015 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | |
| **Контактные телефоны** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71. E-mail: auction@cpo.by** | | |

# ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении 19 октября 2015 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Электромодуль»

| **Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)** | | |
|---|---|---|
| **Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества** | **Начальная цена без НДС, бел. руб.** | **Размер задатка, бел. руб.** |
| «бассейн оборотного водоснабжения» общей площадью 464 кв. м, инв. номер в ЕГРНИ 630/С-70950, расположенный по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Великий Гостинец | 71 223 200 | 7 000 000 |

**Продавец имущества: ОАО «Электромодуль», ул. Великий Гостинец, 143, 222310, г. Молодечно.**

**Организатор торгов: УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.**

**Условие торгов**: победитель торгов (покупатель) течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 3 процентов от цены продажи предметов торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Электромодуль», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся **19 октября 2015 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 08.10.2015 по 15.10.2015 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017)327-48-36 (УП «Минский городской центр недвижимости»)**
**(0176)74-72-04 (ОАО «Электромодуль»).**

**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона со снижением цены**

# ПО ПРОДАЖЕ САНАТОРИЯ «Кооператор»

**(лечебно-профилактический блок со столовой с инв. №600/С-57830, спальный корпус с инв. №600/С-57829, гараж с инв. №600/С-125975, незавершенный незаконсервированный строительством объект (грязелечебница)), расположенного по адресу: Минская обл., Минский р-н, Острошицко-Городокский с/с, район агрогородка Острошицкий Городок, принадлежащего унитарному предприятию «Поречье Белкоопсоюза» (Продавец) на праве хозяйственного ведения.**

Земельный участок площадью 0,9494 га с кадастровым номером 623685200001000048.

**Начальная цена с НДС – 10 902 360 000 бел. руб.**
**Задаток – 1 090 236 000 бел. руб. Шаг аукциона – 5%.**

*Задаток перечисляется на р/с №3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже санатория УП «Поречье Белкоопсоюза»,* **проводимом 10 ноября 2015 г.**

Аукцион состоится **10.11.2015 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 06.11.2015 до 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 6. Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 28.04.2015.

Условия участия, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

**Телефоны для справок:**
**8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52.**

HOME CREDIT BANK

**Открытое акционерное общество «Хоум Кредит Банк»**

Республика Беларусь, 220018, г. Минск, ул. Одоевского, 129.
Тел.: (8017) 229 89 91, **www.homecredit.by**

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2015 г.

*(в миллионах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.10.2015 | 01.10.2014 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 124 194 | 66 586 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 745 264 | 913 145 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 134 358 | 157 387 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 163 356 | 60 999 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 1 491 440 | 1 473 817 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 325 | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 214 856 | 114 494 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | - | - |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | - | - |
| 13 | Прочие активы | 1112 | 181 305 | 63 097 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | 3 055 098 | 2 849 525 |
| 15 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | 100 576 | 58 765 |
| 17 | Средства банков | 1202 | 741 324 | 755 832 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | 1 689 270 | 1 599 564 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | - | - |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | 32 576 | 26 651 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | 2 563 746 | 2 440 812 |
| 24 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | 144 787 | 144 787 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | 18 487 | 16 500 |
| 28 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 6 612 | 5 995 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | 321 466 | 241 431 |
| 30 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 491 352 | 408 713 |
| 31 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 3 055 098 | 2 849 525 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 октября 2015 г.

*(в миллионах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.10.2015 | 01.10.2014 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 446 203 | 506 568 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 368 444 | 358 666 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 77 759 | 147 902 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 205 628 | 233 588 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 16 825 | 17 001 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 188 803 | 216 587 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 24 | (25) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 7 494 | 7 815 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | (29 160) | (4 827) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 54 794 | 129 541 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 174 941 | 55 584 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 253 254 | 233 761 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 18 038 | 24 857 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 93 775 | 34 877 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 22 946 | 9 482 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 70 829 | 25 395 |

Председатель Правления Щербаков С.Б.

Главный бухгалтер Лаптенок Г.П.

Дата подписания «05» октября 2015 г.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 18, выданная НБ РБ 24 мая 2013 года. УНП 807000056.

белагропромбанк
традиции будущего

# ДОГОВОР СРОЧНОГО БАНКОВСКОГО ВКЛАДА (ДЕПОЗИТА) «Старт 2.0» №

г. ___________ «___» ______________20__ г.

Открытое акционерное общество «Белагропромбанк» (ОАО «Белагропромбанк»), именуемое в дальнейшем «Вкладополучатель», в лице ____________________________________, действующего на основании ____________________________________, с одной стороны, и ____________________________________, именуемый в дальнейшем «Вкладчик» с другой стороны, далее совместно именуемые «Стороны», заключили настоящий договор о нижеследующем.

1. Вкладчик вносит наличными или перечисляет безналичным путем денежные средства в валюте вклада (депозита) на вкладной (депозитный) счет №3414_______________ / __________ в день заключения настоящего договора, а Вкладополучатель принимает их, обязуется обеспечить их сохранность и возвратить наличными денежными средствами, либо безналичным путем (по усмотрению Вкладчика) сумму вклада (депозита) и начисленные проценты в порядке и на условиях, предусмотренных настоящим договором.

2. Вид договора банковского вклада (депозита): срочный.

3. Сумма вклада (депозита) на дату внесения (перечисления) вклада (депозита):

| Сумма вклада (депозита) цифрами | Сумма вклада (депозита) прописью | Валюта вклада (депозита) |
|---|---|---|
| | | |

4. Срок хранения денежных средств на вкладном (депозитном) счете составляет 185 (Сто восемьдесят пять) календарных дней с ___.___._____ по ___.___._____. Дата наступления срока возврата вклада (депозита): ___.___._____.

5. Вклад (депозит) и причитающиеся по нему проценты выплачиваются в валюте вклада (депозита).

6. Размер процентного дохода по вкладу (депозиту) определяется с применением процентных ставок, которые на дату подписания настоящего договора составляют:

за период с 1 по 30 день хранения (_______________________) процентов годовых;

за период с 31 по 61 день хранения (_______________________) процентов годовых;

за период с 62 по 95 день хранения (_______________________) процентов годовых;

